Станіслаў Шушкевіч ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2795) Год LIV | Беласток, 6 снежня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Знікаюць усходнеславянскія гаворкі

— А ці можаце вызначыць мяжу між беларускімі і ўкраінскімі гаворкамі Беласточчыны? — патрабаваў Міраслаў Сцепанюк, дзеяч Саюза ўкраінцаў Падляшша.

— Гэтая праблема дастаткова асветлена ў „Атласе", — прафесар Дарота Рэмбішэўская, працаўнік Польскай акадэміі навук, не пайшла на такую правакацыю...

19 лістапада г.г. на даклад прафесар Дароты Рэмбішэўскай пад загалоўкам «O „Atlasie gwar wschodniosłowiańskich"» сабралася рэкордная ў гісторыі беларускіх чацвяргоў аўдыторыя (арганізатар: Кафедра беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку), у тым ліку і прадстаўнікі Саюза ўкраінцаў Падляшша. Здавалася, не абыдзецца без эмацыйнай спрэчкі. Прадстаўнікі згаданай арганізацыі ад пачатку свайго існавання прыдзіраюцца да дзесяцітомнага выдання Польскай акадэміі навук „Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny". Галоўны іх закід да навуковай крыніцы — межы паміж беларускімі і ўкраінскімі гаворкамі. І асабліва ў наш час, калі названае выданне стала адыгрываць станоўчую ролю ў працэсе польска-беларускага двухмоўя.

Прафесар Дарота Рэмбішэўская

скай. Дзеля доследаў было назначана 114 кропак на тэрыторыі ад Буга па Бобру. Прытым, як адзначыла дакладчыца, шчыльнасць даследаваных кропак, беручы пад увагу, напрыклад, лясныя абшары, не была раўнамернай і абмежаваная яна ў сэнсе шматбаковасці, паколькі ў сітуацыі натуральнага польска-беларускага двухмоўя даследаваліся адны ўсходнеславянскія гаворкі. Вынікі звыш трыццацігадовых экспедыцый апублікаваны ў дзесяці тамах „Атласа" (без чацвёртага тома). Паколькі прафесар Рэмбішэўская прымала ўдзел у стварэнні двух апошніх тамоў (IX і X), яна больш падрабязна распавяла пра іх змест. У перадапошнім памешчана лексіка з галіны апрацоўкі льну, іншай сыравіны і адзежы. Дзесяты па ліку том уключае лексіку з галіны рэльефу, транспарту і камунікацыі, будаўніцтва. „Атлас", на думку дакладчыцы, неацэненая гістарычныя крыніца. Многія назвы зафіксаваныя ў 1950-х гадах сёння не выступаюць у практычным жыцці, яны зніклі разам з многімі прафесіямі і сітуацыямі. Зараз яны існуюць адно ў свядомасці і памяці прадстаўнікоў некаторых пакаленняў. Працэс знікнення ўсходнеславянскіх гаворак на Беласточыне амаль завершаны, у крайнім выпадку яны знікнуць разам са смерцю старэйшага пакалення. Суцяшальнай з'явай з'яўляецца тое, што натуральны пераказ паміж пакаленнямі праходзіць паміж пакаленнем дзядоў і ўнукаў.

— Ці ў сітуацыі, калі мова аўтахтонаў апынулася пад пагрозай знікнення, вядуцца навуковыя доследы? — спыталі мы ў прафесар Рэмбішэўскай.

— На жаль, не хапае на гэта сродкаў, — пачулася ў адказ, — іншая справа, няма сёння такіх энтузіястаў і фанатаў, якія пачыналі і працавалі пры „Атласе ўсходнеславянскіх гавораk Беласточчыны". У гэтым месцы варта назваць прозвішчы Міхала Кандрацюка родам з Дубін і Марыі Чурак родам з Дубіч-Асочных.

PS. У допісе „Бяздомнасць праўды пра Францішка Аляхновіча" („Ніва" ад 15 лістапада г.г.) былі дапушчаны памылкі. Францішак Аляхновіч свае ўспаміны з салавецкай ссылкі надрукаваў не ў „Słowie", а ў „Kurierze Wileńskim", якія ў 1937годзе выйшлі асобнай кніжкай пад загалоўкам „Prawda o sowietach". У чытачоў і дакладчыцы просім прабачэння.

На даклад сабралася рэкордная ў гісторыі беларускіх чацвяргоў аўдыторыя

Ахвяры сістэмы ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У маленькім гарадку Мар'іна Горка, што пад Мінскам, невядомыя забілі актывіста беларускай апазіцыі. Імя Валянціна Доўнара было малавядомае нават многім яго паплечнікам па партыі БНФ. Сябры і знаёмыя кажуць, што гэта быў сціплы і шчыры руплівец беларускай справы, мірны і старанны распаўсюднік незалежнай прэсы. Абсалютна спагадлівы і добры чалавек. Яго знайшлі ў цэнтры горада з прабітай галавой, амаль побач з будынкам мясцовай міліцыі...

У арлянскай школе ☞ 4

Міхал МІНЦЭВІЧ

Феномен „Белавежы"... ☞ 8

Віктар ШВЕД

9 770546 196000

Ахвяры сістэмы

У маленькім гарадку Мар'іна Горка, што пад Мінскам, невядомыя забілі актывіста беларускай апазіцыі. Імя Валянціна Доўнара было малавядомае нават многім яго паплечнікам па партыі БНФ. Сябры і знаёмыя кажуць, што гэта быў сціплы і шчыры руплівец беларускай справы, мірны і старанны распаўсюднік незалежнай прэсы. Абсалютна спагадлівы і добры чалавек. Яго знайшлі ў цэнтры горада з прабітай галавой, амаль побач з будынкам мясцовай міліцыі. Установлена, што пасля таго, як Доўнара збілі, яго абрабавалі. Канешне, нікога не ўдалося затрымаць па гарачых слядах. У прынцыпе такое здараецца не так рэдка, але за апошнія дзесяць гадоў адбылося ўжо некалькі аналагічных і загадкавых смерцяў дэмакратычных актывістаў. Прычым менавіта адзінокіх асоб, людзей без сваёй сям'і. Забойства Доўнара можа быць вынікам звычайнага бандытызму і рабавання, а можа быць і спланаванай палітычнай акцыяй альбо наступствам той грамадзянскай нянавісці, якую сеюць дзяржаўныя прапагандысты. Рабіць катэгарычныя высновы не хочацца і зараз не столькі пра гэта.

Магчыма, па распачатай крымінальнай справе па забойстве Доўнара некага затрымаюць і асудзяць. Толькі нават у такім разе не будзе пэўнасці, што арыштавалі таго, каго трэба. Усе памятаюць так званую „віцебскую" справу, яшчэ за часам СССР, калі па справе серыйных забойстваў былі асуджаны многія нявінныя, некаторыя нават — расстраляны. Савецкая следча-судовая сістэма патрабавала і патрабуе дагэтуль планавага раскрыцця злачынстваў. Таму ўся праваахоўная афіцыйная статыстыка скрозь фальшывая. На практыцы гэта азначае наступнае — калі які-небудзь, прыкладам, раённы аддзел раскрыў за месяц дзесяць злачынстваў, то ў наступным каляндарным адрэзку ён мусіць выявіць на некалькі адсоткаў болей. Іначай супрацоўнікі пазбаўляюцца дзяжурных прэмій, чарговых зорачак на пагоны і іншых службовых ільготаў. Больш таго, калі адсоткі „паспяховасці" раптам знізяцца, то можна атрымаць сапраўднае службовае спагнанне і вымову. Такім чынам падмяняецца сама сутнасць праваахоўных органаў, якія павінны паводле сутнасці здзяйсняць найперш прэвентыўныя меры, папярэджваць злачынствы. Замест гэтага яны пераўтвораны найперш у карныя структуры. Гэта толькі ў Маякоўскага „мая міліцыя мяне бяражэ". У варунках сённяшняй Беларусі — савецкай дзяржавы-рэлікта — міліцыя створана не берагчы, а сцерагчы і запалохваць. Людзі ў цывільным з дзяржайнымі пасведчаннямі ў кішэнях сярод белага дня хапаюць на вуліцы актывістаў дэмакратычных незалежных арганізацый, гвалтоўна вывозяць іх за горад і там кідаюць дзе-небудзь у лесе. Збіванні мірных грамадзян на вуліцах беларускай сталіцы даўно ўжо сталі нормай. Колькі людзей пацярпелі ад фізічнага гвалту ахоўнікаў „парадку" ў форме — напэўна лік ідзе ўжо на тысячы. Ці варта пасля ўсяго гэтага здзіўляцца такому забойству, якое здарылася ў Мар'інай Горцы?

Не меншыя, а напэўна і большыя ахвяры такой заганнай сістэмы — самі міліцыянты. На мінулым тыдні прайшла інфармацыя пра тое, што з пачатку года за п'янства і кіраванне аўтамабілем нецвярозымі затрыманы ўжо 123 міліцыянты і прадстаўнікі ўнутраных войскаў. А колькі такіх выпадкаў было схавана, як кажуць, „прыкрыта". І гэта толькі адзін від парушэння закону. Прытым расце колькасць самазабойстваў сярод супрацоўнікаў праваахоўных органаў. І гэта таксама заканамерна. Чалавечая душа не прымае гвалту, таму такія псіхалагічныя надрывы становяцца звыкласцю. У нас жа стала нормай, што міліцыянты могуць збіваць затрыманага, здзекавацца з яго. Тыя, хто пакліканы пільнаваць закон, парушаюць яго на кожным кроку. Адзін з маіх знаёмых, былы міліцыянт, неяк прызнаўся мне, што звольніўся з гэтай структуры таму, што не мог збіваць падлеткаў, якіх мусіў курыраваць паводле сваіх абавязкаў. У той жа міліцыі хапае прыстойных людзей, якія ўсё разумеюць і не хочуць быць шрубамі рэпрэсіўнага механізма. Але пакуль заганная сістэма „аховы правапарадку" не будзе зменена кардынальным чынам, новыя яе ахвяры ў розных формах непазбежныя.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Паміж молатам і кавадлам

Цяжка жыць беларусам на памежжы, дзе пранікаюцца дзве культуры і два менталітэты — усход і захад. Асабліва гэтае сутыкненне двух розных светаў адчуваецца тут, на Беласточчыне, дзе шмат культур, многа нацыянальнасцей і веравызнанняў. Тут кожны хоча падкрэсліць сваю тоеснасць, каб не згубіцца ў шэрым натоўпе большасці. Многія здаюцца і патанаюць у штодзённых грамадскіх працэсах, але ці кожнаму беларусу на Беласточчыне абыякавае здацца, падняць рукі і памяняць погляд на акружаючы свет, а прытым адрачыся ад свайго, вынесенага з роднай хаты. А вера, нацыянальнасць гэта не старая вопратка, якую змяняеш на новую, каб выглядаць дастойна, элегантна. Але ці ў гэтай элегантнасці будзеш адчуваць сябе сабою, а не манекенам з выставы штодзённасці?

Чалавека цягне да вытокаў праўды, да карэнняў, да продкаў і гісторыі. Гісторыя перамешваецца з нацыянальнымі стэрэатыпамі, вынесенымі з хаты — ад бацькоў, дзядоў, выхаваных у іншых часах, часта цяжэйшых, чымсьці зараз. Вопыт бацькоў і дзядоў паважаецца, бо ж гэта сямейныя аўтарытэты, але ці іх погляды можна ўкласці ў рамы сённяшняй рэчаіснасці, у якой так цяжка аднайсці праўду. Памерлы ў гэтым годзе польскі філосаф Лешак Калакоўскі казаў: праўды ды спавядлівасці няма, ёсць няроўнасць у грамадстве. Коштам няшчасця адной асобы поспех мае другі чалавек і г.д. Кола закрываецца.

Палякам мы — рускія, а беларусам з Беларусі — палякі. Не дакажаш ім, што калі мы нараджаліся ў роднай хаце, не чулася тады польскага слова, толькі падляшскую гаворку, а польскую мову пазнавалі мы ў школе. Колькі б ты дасягнуў у галіне беларускай культуры, то не дакажаш сваёй прывязанасцю, што ты іх, бо дзеліць нас менталітэт: у іх — усходні, а ў нас — заходні. Яны становяцца больш усходнія, а мы пад уплывам працэсяў паланізацыі і асіміляцыі — больш заходнія. Поп-культура ў масмедыях мае моцнае ўздзеянне на выхаванне моладзі і грамадства. Будуе новыя звычаі, нішчыць стэрэатыпы і ўсе становяцца аднолькавыя ды ў падобнай, нічым шэрыя ўніформы, унутранай абыякавасці маршыруем насустрач будучыні. Адрачэнне ад традыцыі не з'яўляецца простым выхадам да ўнутранага шчасця.

Астаюцца толькі творчыя адзінкі, якім неабыякавы лёс грамадства. Яны стараюцца будаваць адну вежу праўды, але ў будоўлі дзеляцца, усе хочуць будаваць наверсе, але на верх не ўсе ўзлазяць. Зараз не ў розуме верх, але ў сіле і тыя, што на верх увайшлі, тым хапіла многа сілы, каб прабіцца з натоўпу. Унізе часта наступаюць нацыянальныя падзелы і новую вежу будуюць тыя знізу, каму не хапіла сілы ўзлезці на гару першай будоўлі. І паўстае ніжэйшая будоўля, але таксама са сваёй вярхушкай. Абедзьве будоўлі змагаюцца, каб як найбольш людзей прыцягнуць у свой будынак. Калі адны ладзяць выстаўкі прыгожых малюнкаў, другія ладзяць забаву пад прыгожую музыку. На малюнкі прыйшло менш людзей, чым на забаву, то тыя ад малюнкаў робяць агляд фільмаў на роднай мове. Ну і на фільмы больш прыйшло, то тыя ад забавы ладзяць конкурсы.

І так спаборнічаюць дзве будоўлі, гаспадары якіх калісьці былі сябрамі, разам пілі каву, гарбату, а нават гарэлку, а зараз адзін на другога ваўком пагляне як на чужога з іншай планеты. Часам падумаеш, як умела сказаў вядомы расійскі рэжысёр Мікіта Міхалкоў у фразе са свайго фільма: „Чужы сярод сваіх — свой сярод чужых". Так у нас ёсць і з беларусамі, і з украінцамі, якія калісьці былі таксама беларусамі, і з праваслаўнымі палякамі. А жыццё бяжыць наперад і яшчэ расставіць усіх на свае месцы.

Юрка БУЙНУК

Вачыма еўрапейца

Дзень талерантнасці

Ужо чарговы раз 16 лістапада па ініцыятыве ЮНЕСКА адзначаўся Міжнародны дзень талерантнасці. Мінуў ён у прынцыпе без розгаласу, як, дарэчы, шмат такіх іншых дзён „з нагоды", прыдуманых разнавіднымі міжнароднымі і іншымі, таксама нацыянальнымі, арганізацыямі. ЮНЕСКА хацела, каб гэты дзень быў асаблівым часам — як гэта медыйна акрэсліваецца: часам одуму над нашым стаўленнем да іншых. Сярод масы бягучых інфармацый — грыпозных, азартных і іншых — сёлета ў Польшчы такім часам ён не быў. А шкада, хоць бы глядзеўшы на нядаўнія даследаванні наконт стаўлення падляшскай моладзі да культурнай іншасці. Вынікае з іх, што большасць маладых людзей дэкларуе пазіцыю талерантнасці, але з талерантнасцю на практыцы ўжо горай. Апаскі выклікаюць між іншым іншаскурыя асобы. Адносна высокая ў гэтай групе павага для рэлігійнай адрознасці.

Згодна з дэфініцыяй і значэннем лацінскага слова: tolerare, гэтая пазіцыя значыць „цярпенне і зразуменне для іншасці" і — як сцвярджаюць сацыёлагі — з'яўляецца „адной з найважнейшых грамадскіх доблесцей і асновай грамадскага парадку" ды „ўшанаваннем чужых пачуццяў, поглядаў, схільнасцей, веравызнання, абычаю і паводзін, калі нават яны адрозныя ад нашых, або мелі б з імі быць зусім супярэчлівымі".

Шкада, што Дзень талерантнасці мінуў без рэха, паколькі ў Польшчы ўсё ставіцца пытанне межаў талерантнасці. Усё яно ставіцца, хоць з 1948 г. Дэкларацыя правоў чалавека вызначыла для кожнага з нас „права на жыццё, свабоду і асабістую бяспеку, на свабоднае перамяшчэнне і выбар месца жыхарства, на працу, адукацыю, свабоду слова і згуртаванняў". Як паказваюць прыклады некаторых дзяржаў, гэты фрагмент Дэкларацыі можна надалей свабодна нагінаць, расцягваць, інтэрпрэтаваць. Значыць, межы талерантанасці звязаныя з гэтымі правамі — расплыўныя. Не датычаць яны, дарэчы, цэлых інстытуцыянальна-дзяржаўных сістэм, але і ўтрымліваючыхся ў грамадствах стэрэатыпаў. У Польшчы — як паказваюць даследаванні — усё значная частка апытваных упэўненая ў тым, што, напрыклад, мужчына павінен зарабляць на дом, цыганы гэта злодзеі, мала ў нас выдатных жанчын, італьянцы — сварлівыя, рыжыя — фальшывыя, а тоўстыя — лянівыя, але жыццярадасныя. На думку навукоўцаў, людзі неталерантныя, бо: непрыязнасць у адносінах да іншых закладзена ў іх натуру, адчуваюць пагрозу, апасаюцца канкурэнцыі, шукаюць апраўдання для ўласнай агрэсіі, разгружаюць уласныя адмоўныя пачуцці і комплексы, папраўляюць сваё самаадчуванне, чэрпаючы пачуццё сілы ад прыналежнасці да „нармальнай" большасці.

І так сабе 16 лістапада лістаў я даследаванні аб талерантнасці. І прыпомніўся мне адзін асабісты эпізод. Ішоў я аднойчы вечарам у канцы васьмідзесятых пецярбургскай (тады яшчэ ленінградскай) пустой вуліцай у новенькіх, заходніх джынсах. Зачапіў мяне тыповы жулік. „Ну так, напэўна дасць мне ў морду", — падумаў я адразу. Мы хвіліну стаялі насупраць сябе. Акінуў ён мяне пільным зрокам ад галавы да пят. „Ты не наш, ты не русский!" — ацаніў. „Jestem Polak!" — енкнуў я ў жаху. На гэта ленінградскі агрэсар: „Живи!". І знік за вуглом. І ад гэтага часу я быў упэўнены, што нават рускае жуллё талерантнае ў адносінах да палякаў. А і я палюбіў іх. Я, здаецца, таксама талерантны. Прынамсі павінен ім быць: мог жа ж ён мне даць у каплех, або хоць здзерці джынсы!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Размова са Станіславам Шушкевічам

Ад прынцыпаў нельга адступаць

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Станіслаў Шушкевіч (першы справа) прымаў удзел у канферэнцыі „Rediscovering Eastern Europe”

***Прафесар Станіслаў Шушкевіч**, па прафесіі фізік, старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі ў 1991-1994 гадах. Удзельнічаў у двухдзённай (20-22 лістапада 2009 г.) канферэнцыі „Rediscovering Eastern Europe”, прысвечанай галоўным чынам грамадска-навуковай праблематыцы. Прынялі ў ёй удзел м.інш. прадстаўнікі дзярждэпартамента ЗША. Яе агранізатарам былі Кафедра гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы і Інстытут гісторыі Універсітэта ў Беластоку.*

„Ніва”: — *Як Вы ацэньваеце становішча апазіцыі ў Беларусі?*

Станіслаў Шушкевіч: — У нас нармальная апазіцыя, у беларускім сэнсе. А ў сусветным і еўрапейскім сэнсе — наогул яе няма. Таму што апазіцыйна зарыентаваныя дэпутаты былі выгнаны з парламента ў 1996 годзе. У нас ёсць тыя людзі, якія супрацьстаяць уладзе, нязгодныя з той палітыкай, якую праводзіць наша ўлада. Мне здаецца, што апазіцыя гэта даволі аднародная структура, але яна падзялілася зараз на дзве часткі. Адны, якім падабаецца быць у апазіцыі — яны гатовы там быць усё жыццё, таму што фактычна нічога іншага рабіць не ўмеюць. А другія — якія фактычна хочуць змяніць сітуацыю. Адным словам — адны працуюць на працэс, другія — на перамогу. Я паважаю апошніх — тых, хто працуе на перамогу, і маю дачынне менавіта да іх.

— ***А хто гэта?***

— Іх вельмі многа. Не будзем пералічваць. Акрамя таго няма такой рэзкай граніцы паміж гэтымі групоўкамі. Я не хацеў бы некага асуджаць, але па паводзінах, калі я буду вам адказваць, я назаву гэтыя імёны.

— ***А ці магчымы адзін кандыдат ад апазіцыі на прэзідэнта?***

— У нас зараз няма кандыдата на прэзідэнта ад апазіцыі, які выдзелены быў бы нармальным дэмакратычнам чынам. У нас ёсць людзі, якія знайшлі сродкі падтрымкі ў Еўропе, і таму яны займаюць больш важкае становішча. Затое яны больш вядомыя ў Еўропе, чым у нас, у Беларусі. Яны выкарысталі той факт, што апазіцыя дэмакратычным чынам іх вылучыла ў свой час, яны працягваюць гэтую працу, забыўшыся пра апазіцыю, якая іх парадзіла.

— ***Каго Вы маеце на думцы?***

— Я маю на думцы Аляксандра Мілінкевіча. Проста напраста. Таму што трэба памятаць аб тых узаемадзеяннях, якія былі пароджаны. Больш гарачага прыхільніка Мілінкевіча чым я не было. Я цешыўся, калі ён быў абраны, і лічыў, што гэта чалавек, які будзе працаваць толькі на Беларусь. Цяпер мне здаецца, што яго згодніцкая пазіцыя з уладай мяжуе з амаральнасцю. Ведаеце, нельга гаварыць пра тое, што ты будзеш ладзіць з уладай, якая паступае амаральным чынам. І нельга арыентаваць Еўропу такім самым чынам паступаць з гэтай уладай. Мне здаецца, што наш святы абавязак — тлумачыць і Еўропе, і нашаму насельніцтву, што адбываецца і чаму. Вось гэтага я апошнім часам не бачу. Чаму? Мілінкевіч гаворыць пра дыялог. З кім дыялог? Дыялогу няма. Няма нават пачатку дыялогу. Ён гаворыць пра грамадскі кантроль за дыялогам. Прабачце: грамадства будзе само сябе кантраляваць, калі яно будзе весьці кантроль за дыялогам? Ёсць набор дэмакратычных прававых тэрмінаў, якія тлумачаць абставіны ў нас. А на самой справе Мілінкевіч карыстаецца тым, што ён больш за іншых заўважаны на Захадзе. Я яшчэ раз паўтараю: можна рабіць з сябе вельмі энергічнага чалавека і від, што ты вельмі энергічны, але гэта не азначае, што мы маем нейкія зрухі. У нас адбыліся вельмі, вельмі малыя зрухі да павагі правоў чалавека. У нас дзве газеты атрымалі права быць прадаванымі ў кіёсках. Гэта „Наша ніва” і „Народная воля”. Але я б хацеў — калі такі разумны Мілінкевіч, ён памятае арыфметыку, мае фізічную адукацыю, так як я — проста параўнаць тыраж гэтых газет (разам выходзіць найбольш сто тысяч у тыдзень) з двума з паловай мільёнаў у тыдзень самой „Савецкай Беларусі”. Гэта кропля ў моры. І захапляцца тым, а не патрабаваць, каб іншыя газеты мелі такое права, могуць толькі тыя людзі, якія забыліся, чым яны займаюцца!

— ***Вы ўжо ўспомнілі пра гэта, але як Вы ацэньваеце палітыку Еўрасаюза і ЗША ў адносінах да Беларусі?***

— Перш за ўсё падзелім. Мне здаецца, што Злучаныя Штаты Амерыкі — нам часам здаюцца занадта „прамалобымі” — але яны ніколі не адступалі і не адступаюць ад дэмакратычных прынцыпаў. Яны патрабуюць правоў чалавека, дэмакратыі, свабоды слова. Еўропа праводзіць зараз гэтак званы *Realpolitik*. Я таксама паважаю рэальную палітыку, але калі гэтая палітыка фактычна з'яўляецца палітыкай здрады, палітыкай невялікай павагі да тых сіл, якія супрацьстаюць Беларусі — паважаць нельга. Як я магу паважаць *Realpolitik*, калі ўсе звенні маёй улады, ад прэзідэнта да раённага суддзі, пацвярджаюць, што пенсія, якую мне прызначыў прэзідэнт насуперак закону (ён захаваў яе на тым узроўні, на якім была яна ў 1997 годзе, гэта значыць, што яна абясцэнілася ў 400 разоў) — і ўсе галіны ўлады лічаць, што гэта правільная пенсія. І ўсе пацвярджаюць дакументамі. Гэта і Савет Міністраў, і абедзве палаткі так званага парламента, і міністэрствы ўсе, і суддзі. Што гэта за амаральная ўлада, дзе не працуе закон, а працуе толькі тэлефоннае права? У мяне ёсць мінімальная пенсія ў Беларусі, але нават гэтай пенсіі няма. Вы мне прабачце. Я езджу па свеце, я зарабляю. Я за той час атрымаў чатыры разы званне *Doctor honoris causa*, у тым ліку ў Каталіцкім універсітэце ў Любліне ў Польшчы. Я пакуль што здольны зарабляць. Як можа быць такая знявага чалавека? Я не прыніжуся да таго, каб, так сказаць, угаворваць Лукашэнку прымяніць закон. Я працую па законе, а закон у нас не працуе. Людзі застаюцца ў зусім нікчэмным стане, яны абмануты, яны прыніжаны, іх выкідваюць з работы, іх пазбаўляюць сацыяльных правоў... І з гэтай уладай яны хочуць весці дыялог! Добра, дык няхай будзе дыялог! Дыялогу ж няма ніяк, няма ні аднаго кроку да дыялогу! Увесь час ідзе размова. Улада абяцае, што будзе дыялог, а разганяе ўсе структуры, якія створаны для дыялогу. Ну, а нашы апазіцыянеры, якія былі нашым гонарам (я вельмі ганарыўся, што ёсць у нас такі Мілінкевіч, адукаваны чалавек, сапраўдны беларус, прыгожы, прыстойны ...) — і раптам: пагаджэнне з уладай! Гэта пачалося ў Празе, калі мы падпісвалі заяву пратэсту супраць таго, каб туды прыязджаў Лукашэнка. Гэтую заяву падпісалі Івонка Сурвіла, Аляксандр Казулін, Зянон Пазьняк, я, і раптам Мілінкевіч кажа: „Не, я не падпішу, бо тут мы не вельмі паважліва ставімся да Расіі”. Як я маю паважліва ставіцца да Расіі, калі яна падтрымлівае дыктатара? Я павінен цалавацца з ёю?! Калі я чалавек прынцыповы, я павінен заявіць і пра Расію тое самае. Я хачу дружыць з рускімі, вось побач мяне сядзіць жонка, руская, я паважаю рускіх, але я не магу пагадзіцца з расійскай палітыкай, накіраванай на падтрымку дыктатуры! Ад прынцыпаў нельга адступаць.

— ***У гэтым кантэксце, як Вы ацэньваеце рашэнне аб прадаўжэнні адмянення еўрасаюзных санкцый у адносінах да Беларусі (да кастрычніка 2010 года)?***

— Я ацэньваю гэта добра. Хаця самыя гэтыя санкцыі — неэфектыўныя. Калі „Бацьку” не пускаюць у Еўропу, а дзеткі маюць магчымасць займацца ў найлепшых універсітэтах свету, калі „Бацька” крадзе за кошт беларускага народа грошы і можа забяспечыць сваіх дзяцей, дык што гэта за санкцыі? У амерыканцаў былі разумныя санкцыі. Яны вылічылі, хто дзе мае якія эканамічныя сувязі і выстраілі па пэўных кропках, і гэта было вельмі эфектыўна, мэтанакіравана. Еўрапейскія санкцыі — неэфектыўныя. Але тое, што яны рашылі працягнуць іх адмяненне, паказвае, што Еўропа задумалася над тым, што яна робіць.

— ***Як Вы ацэньваеце апошняе выказванне Ежы Бузка, што гэта „апошні шанц для Беларусі”?***

— Перш за ўсё няма больш паважанага для мяне чалавека ў Польшчы, чым Ежы Бузэк. Для мяне такіх ёсць дзве-тры асобы — Ян Павел II, Лех Валэнса. Гэта асобы, якімі можа ганарыцца Польшча. Я не выключаю, што ў Ежы Бузка не зусім дакладная інфармацыя аб Беларусі. Таму што тыя, што зараз да яго прабіваюцца, — яны відавочна не зусім правільна тлумачаць тое, што адбываецца. Які „апошні шанц”? Што гэта значыць „апошні шанц”? У нас кажуць, „апошняя ў папа жонка”. Шанцу мы не страцім. Скажам так: каб мы мелі сапраўдную падтрымку Еўропы, хаця б у тых адносінах з Расіяй! Еўропа ж не прызнала ні адных нашых выбараў з 1996 года. А Расія ўсе прызнае і хваліць нас за гэта. Але ў Еўропы ніколі не хапіла мужнасці сказаць Расіі: „Што вы робіце!?” Мы гэта робім, мы гэта і кажам. Я думаю, што Ежы Бузэк зойме, і займае, дастойную пазіцыю.

— ***Калі ласка, спадар прэзідэнт, падагуліце: які ёсць сцэнарый, якая тактыка, і ў чым заключаецца гульня прэзідэнта Лукашэнкі ў адносінах да Захаду?***

— Калі Лукашэнка пачаў праваль-

працяг ☞11

Не пашанцавала

— Ад крадзенага не пасыцееш, — напамінае народная мудрасць. Пераканаліся ў гэтым два гайнаўскія асобені, якіх 12 лістапада ўвечары затрымалі паліцэйскія на вуліцы Мілкоўскага ў Гайнаўцы. У час кантролю выявілася, што нясуць яны ў мяшках... два парэзаныя дарожныя знакі. Мужыкі рашылі прадаць набытак у якасці металалому і „дарэмныя" грошы прызначыць на выпіўку. Не пашанцавала. За злачынства будуць прыцягнены да судовай адказнасці.

Іншай хітрынкай пакарыстаўся 25-гадовы жыхар Нараўкі. Падключыўся ён да энергетычнай лініі па-за лічыльнікам і незаконна карыстаўся электратокам, учыняючы гэтым самым шкоду Бельскаму энергетычнаму прадпрыемству. Злачынства выявілі паліцэйскія Павятовай камендатуры. Варта адзначыць, што пакража электраэнергіі здараецца не толькі ў Нараўцы. Гэтая паталагічная з'ява вядомая ў маштабе краіны. Людзі эканомяць такім чынам, бо прымушаюць іх да таго як прынцыпы рынкавай эканомікі, так і атмасферныя ўмовы. Не ўяўляюць яны таго, што за такую злачыннасць пагражае ім штраф да 1500 зл., а ў выпадку незаплачанага рахунку — адключэнне электратоку.

Няўдачлівая „трынаццатка"

У прынцыпе не верыў я ў кепскія знакі. Усё аднак прадказвае, што яны здзяйсняюцца. Вось гэтаму доказ.

13 лістапада рашыў я зранку паслаць тэксты ў „Ніву". Нічога не прадвяшчала, што хтосьці мне ў гэтым перашкодзіць. І тут жа пазваніў тэлефон. У трубцы пачуў я жаночы голас. Не прадстаўляючыся, дамачка паслала мне град няветлівых эпітэтаў, а ў канцы назвала мяне „старым дурнем" і абарвала размову. Не паспеў я нават слова сказаць. Не думаў я браць „рэванш", ідучы следам маёй суразмоўцы, бо гэтая асоба мне добра знаёмая. І, што скажаце наконт „трынаццаткі", даражэнькія? Хлуслівая брахня папсавала мне не толькі настрой на цэлы дзень, але і павысіла ціск крыві. Не паслаў я тэкстаў у рэдакцыю, адно пачаў задумвацца над паводзінамі фарысеяў, якія моляцца перад фігурай, а д'ябла маюць за шкурай.

(ус)

Дапамога пенсіянерам

Ужо ад некалькіх добрых гадоў члены Саюза пенсіянераў атрымліваюць харчовую дапамогу. Гэта, між іншым, харчы першай патрэбы: малако, мука, макароны, крупа, цукар, збожжавая кава, кансервы. Нараўчанскі Саюз пенсіянераў, які налічвае больш за 400 сяброў, у 2008 годзе раздаў у якасці дапамогі 14 тон харчоў.

Сёлета, з-за агульнага крызісу, пенсіянеры з Нараўкі атрымалі з Ваяводскага саюза 8,5 тон харчовых прадуктаў. Дапамога ў першую чаргу дастаецца найбяднейшым пенсіянерам. Варта быць членам Саюза песніянераў!

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

У арлянскай школе

Калі б параўнаць школьнае жыццё ў час г.зв. камуны з сённяшнім, дык яно зараз больш актыўнае і культурнае. Кожная эпоха нясе змены. Гэты размах здзіўляе старэйшае пакаленне і, мабыць, далей будзе здзіўляць. Трэба лічыць высакародным факт, што цяперашняя школьная моладзь стараецца захаваць памяць пра мінулыя эпохі, пра сваіх продкаў, а так дзеецца ў арлянскай школе. Становіцца традыцыяй, што некаторыя вучні паспяхова займаюцца запісамі дакументальных фільмаў.

Фота са школьнага архіва

У Варшаве. Злева: Міраслава Раманюк, Аскар Цюлькевіч і Кацярына Буйнюк

Жыццё арлянскага комплексу школ, у якім вучацца 228 вучняў, у тым ліку 34 у нулявым класе, бурліць дынамікай, а да таго ж варта падкрэсліць, што няма тут клопатаў з навучаннем беларускай мовы. Я папрасіў дырэктара Дарыюша Яна Гарадэцкага зрабіць падлік найважнейшых падзей за першыя два месяцы бягучага навучальнага года.

Ужо 4 верасня адбылася сустрэча першых трох класаў пачатковай школы з прадстаўніком паліцыі на тэму „Бяспечная дарога ў школу". 13 верасня выпускніца нашай гімназіі Кася Буйнюк і вучань трэцяга класа гімназіі Аскар Цюлькевіч з настаўніцамі Мірай Раманюк і Аннай Баршчэўскай выязджалі ў Варшаву на прэзентацыю вынікаў чацвёртага выпуску агульнапольскай праграмы „Вяртайма памяць". Агулам у ёй удзельнічала каля сарака школ з цэлай краіны, у тым Заблудаў, Бельск і Орля з Падляшскага ваяводства. Нашы прадстаўнікі паказалі фільм, які знялі тут на працягу года. Выступілі ў ім пажылыя жыхары Орлі Сцяпан Рыбак, Люба Багацэвіч (абое ўжо не жывуць), Вера Федаровіч, Юлія Мартыновіч, Жэня Пасечнік, Вера Валкавыцкая, Лявон Мураўскі, Пётр Мартыновіч, Уладзімеж Здановіч і Аляксандра Дэмбарук ды Віктар Швед з Мора і адзін жыхар Шарнёў.

На іншы конкурс быў дасланы самастойна запісаны Аскарам Цюлькевічам фільм „Сябры са школы, знаёмыя з суседства", пра яўрэяў. Рашэннем Музея гісторыі польскіх яўрэяў гэты фільм атрымаў першы прыз.

15 верасня адбыўся бацькоўскі сход, які выбраў новую Бацькоўскую раду; яе старшынёй абраны Ян Карпюк.

Тры дні — 18, 22 і 23 верасня — праводзілася акцыя „Прыбіране свету" пад наглядам настаўніцы Бэаты Гарадэцкай. Гміна даставіла школе фольгавыя мяшкі, рукавіцы і транспарт для вывазу смецця. Маладыя людзі выйшлі галоўным чынам у лясы ўздоўж шашы: побач лесу званага Борам каля Орлі ды ў напрамку Рудутаў і Шчытоў.

24 верасня адбыўся пластычны конкурс „Ян Павел II ў вачах дзяцей", ладжаны Музеем, што ў бельскай ратушы. Праца Магды Рахвал з другога класа гімназіі была вылучана на выстаўку. У той жа дзень адбыліся спартыўныя спаборніцтвы — кросы, у якіх стартавала дваццаць вучняў; дваіх з іх атрымалі пуцёўкі ў наступны этап.

29 верасня заявілі мы вучняў другога класа нашай гімназіі да праграмы „Kleszcz mały czy duży, nic dobrego nie wróży". Паралельна заявілі мы школу да навучальнага праекта „Натуральная адукацыя" для школьнай моладзі з абшару „Натура 2000" для паўночна-ўсходняй Польшчы; атрымалі мы пацвярджэнне, што школа прынята да праграмы. Заняткі будуць адбывацца ў нашых памяшканнях, а пасля будзе бясплатная экскурсія ў адну з мясцовасцей абшару „Натура 2000".

5 кастрычніка адбылося пасвячэнне ў вучні першакласнікаў пачатковай школы. Тады дырэктар афіцыйна прынае алоўкам плячо навучэнца, аб'яўляючы яго паўнапраўным вучнем, а войт штогод фундуе сувеніры.

6 і 7 кастрычніка шэсць асоб ад нулявога да шостага класаў падставоўкі прынялі ўдзел у дэкламатарскім конкурсе „Паэтычнае трохгалоссе" ў Бельску-Падляшскім.

8 кастрычніка адбылося пасвячэнне ў вучні першакласнікаў гімназіі, атрасіны і школьная дыскатэка. Войт і старшыня Гміннай рады ўручылі новым вучням сувеніры.

13 кастрычніка адбылася ўрачыстая лінейка, прымеркаваная да Дня нацыянальнай адукацыі.

20 кастрычніка вучні пятага і шостага класаў пачатковай школы выязджалі ў Беласток на фільм і ў Бельск у музей.

26 кастрычніка быў выезд на кросавыя спаборніцтвы ў Бельск-Падляшскі.

З 26 кастрычніка да 9 лістапада ў школе прэзентавалася аб'язная выстаўка „Падляшша, пейзаж, чалавек і асяроддзе". Была яна падвядзеннем фатаграфічных майстар-класаў, у якіх прынялі ўдзел тры вучні арлянскай школы. Майстар-класы доўжыліся з красавіка, а арганізавала іх згуртаванне „Акно" з Бельска-Падляшскага. Вернісаж і паказ выстаўкі адбыліся на бельскім чыгуначна-аўтобусным вакзале.

З лістапада вучні бралі ўдзел у III конкурсе патрыятычнай песні гімназічных і звышгімназічных школ павета, які праходзіў у Бельску-Падляшскім.

17 лістапада прайшоў чацвёрты ўжо Дзень беларускай культуры (якіх ініцыятарам быў сам дырэктар Гарадэцкі — М. М.). Як гэтае мерапрыемства ўплывае на моладзь?

— Я заўважаю ў школе тры групы моладзі. Першую групу складаюць свядомыя беларусы, якія вывучаюць беларускую мову, захоўваюць сваю культуру, вывучаюць яе, развіваюць. Мы паказваем іх працы на ўроках беларускай мовы і ў час пазаўрочных заняткаў.

Другую групу складаюць небеларусы, якія не вывучаюць беларускай мовы, але жывуць побач беларусаў і ўзаемна з імі знаёмяцца.

Той наш урачысты Дзень беларускай культуры скіраваны да трэцяй групы, якую складаюць дзеці з беларускімі каранямі, але якія па розных прычынах не наведваюць урокаў беларускай мовы — мо яны не хочуць, можа саромяцца, можа бацькі не зацікаўлены. А менавіта тут роля бацькоў, і гэта ім прапануем гэтае мерапрыемства каб яны ведалі, што гэта нешта сваё, што можа варта вывучаць тую беларускую мову, можа варта захоўваць спадчыну нашых дзядоў, пра якую крыху забываюць самі бацькі.

Ці гэтая трэцяя група меншае?

— Сітуацыя ў нас стабільная, значыць дзеці не кідаюць навучання беларускай мове, а наадварот, з пераходам з пачатковай школы ў гімназію да навучання беларускай мовы далучаюцца яшчэ дзве-тры асобы. І я лічу, што большае значэнне маюць адна ці дзве асобы, якія свядома запісваюцца вывучаць беларускую мову, бо ў гімназіі, па сутнасці, яны ўжо ведаюць, чаго хочуць.

З пачатку лістапада асобныя вучні з розных класаў бяруць удзел у праекце „Тыгель даліны Бага", разам са згуртаваннем Лакальная група дзеяння з Драгічына. Згуртаванне недзе прыкмеціла нашу школу, заўважыла, што працуем у рэгіянальнай справе і запрапанавала нам супрацоўніцтва. Агульнай мэтай гэтага праекта з'яўляецца захаванне ад забыцця традыцый і абрадаў падляшскай вёскі, асабліва традыцыі прымянення зёлак. Зараз здымаем фільмы з пажылымі жыхарамі нашай гміны пра рознае прымяненне зёлак — у рэлігійных абрадах, у хатняй гаспадарцы, у лекаванні, у хрысцінных, вясельных і пахавальных абрадах. І аказваецца, што і цяпер ёсць жанчыны, якія збіраюць зёлкі і карыстаюцца імі ў народнай медыцыне. Частку матэрыялу мусім хутка — да пачатку снежня — сабраць і даставіць у Драгічын, дзе згуртаванне рыхтуе зборную публікацыю пра прымяненне зёлак на Падляшшы. Мы — арлянская школа — з'яўляемся адным з пастаўшчыкоў інфармацыі.

Гэта што збярэм хочам выкарыстаць і ў сваіх мэтах, а менавіта зняць дакументальны фільм і выслаць яго на конкурс „Пазнаем бацькаўшчыну", бо нечакана аказваецца, што некаторыя справы, пра якія нешта ведаем, крыху чуем, надалей у нас функцыянуюць, хаця цяпер прымяненне зёлак значна меншае чым даўней.

Пакуль збіраем неапрацаваны матэрыял. Інтэрв'ю здымаем на стужку, а гэта важна, бо такім чынам запісваем мясцовую мову, збіраем мясцовую зёлкавую лексіку, гаворкі паасобных вёсак, канкрэтныя прыклады прымянення зёлак калісь і цяпер.

Ці фільмаванне становіцца арлянскай традыцыяй? Дзеці рады гэтым займацца, бо цікавяць іх новыя тэхналогіі, праекцыя новага ў мінулае, якое паволі аджывае. Мы гэта захоўваем у накапляльніках, бо праз нейкі час, мо за дваццаць гадоў, можа аказацца, што ніхто пра некаторыя справы не будзе помніць.

За апошнія тры гады сабралі мы ў школьны архіў звыш дзесятка шматгадзінных фільмаў на розныя тэмы, але ўсе яны звязаныя з Орляй і наваколлем.

Размаўляў Міхал МІНЦЭВІЧ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

З багаццем народнай творчасці

„Малінкі" запрэзентаваліся з абрадам „Юр'е"

У час XVI Прэзентацый „Беларускі абрад на сцэне", што 22 лістапада адбыліся перад шматлікай публікай у Гайнаўскім доме культуры, выступілі лепшыя знатакі народнай творчасці, жанчыны і мужчыны з вясковых і гарадскіх калектываў, якія яшчэ са сваёй маладосці памятаюць жывы фальклор. Рыхтуючыся да паказу даўніх абрадаў і песень, яны на свой спосаб даследуюць народную творчасць. На мерапрыемства прыбыло многа дзетак і моладзі, якія абрадныя выступленні лічаць займальнай гульнёй у народны тэатр, а ў час рэпетыцый ахвотна вучацца апрацаванаму і аўтэнтычнаму фальклору. Раней прэзентацыі народных абрадаў ладзіліся ў Нарве, Ласінцы і Гарадку, але ад чатырох гадоў загасцявалі таксама і ў Гайнаўцы. Апошнім часам калектывы, якія рыхтаваліся да агляду ў Гайнаўцы, паказаліся перад публікай іншых мясцовасцей. У гэтым годзе абрадныя мерапрыемствы два разы ладзіліся ў Беластоку і па адным разе ў Бельску-Падляшскім і Рыбалах.

Першым на сцэну выйшаў вучнёўскі калектыў з Гайнаўскага дома культуры, якім апякуецца Вера Масайла, і ўдала паказаў абрад „Хлеб — святая рэч". З гэтай пастаноўкай прэзентаваўся ён раней у Беластоку (апісвалі мы гэта ў „Зорцы"). Дашкольнікі з Садка № 7 у Бельску-Падляшскім адважна і цікава запрэзентавалі сцэнку „Уваходзіны ў новую хату", якую падрыхтавалі пад кірункам Іаанны Юзючук і Тэрэсы Артэмюк. Калектыў „Жэўжыкі" з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім займальна паказаў абрад „Як то з ільном было" і выступіў са сцэнкамі, апрацаванымі на падставе забаўлянак, вылічанак і дзіцячых гульняў, змешчаных у кніжцы „Як выскочыў воробей", падрыхтаванай Дарафеем і Альжбетай Фіёнік.

— Дзеткі рады вучобе нашым народным гульням, нашым традыцыям. Вельмі ахвотна дапамагаюць нам бацькі, якія прывозяць дзетак на заняткі, а пасля на выступы, — заяўляе апякунка дзетак Марыянна Ваўрусевіч, а Анна Фіёнік напамінае, што дзіцячы калектыў дзейнічае ад двух гадоў і паказваў ужо „Юр'е", калядкі і іншыя сцэнкі.

Вельмі ўдала выступіў калектыў з Вясковага дома культуры ў Рыбалах пад кіраўніцтвам Лідзіі Мартынюк, які паказаў абрад „Гоготуха". Дзеткі, бацькі і жанчыны з калектыву выканалі прыгожую зімовую дэкарацыю. Добра атрымалася таксама супрацоўніцтва на сцэне паміж маладзенькімі і старэйшымі акцёрамі, якія паказалі гульні і фокусы, характэрныя для навагоднягa перыяду.

— Наша выступленне было падрыхтаванае ў рамках праекта „Вясковыя дзеткі на сцэне. Традыцыя і сучаснасць у беларускай культуры". З „Гоготухой" мы выступалі ўжо ў Рыбалах. Нашы дзеткі ўмеюць яшчэ размаўляць па-свойму і таму могуць паказваць нашы даўнія абрады ў арыгінале. Выступаюць яны з песнямі і абрадамі, каб не забыць беларускай культуры, — гаворыць Лідзія Мартынюк.

Дзеткі з Рыбалаў, Паўлаў і суседніх мясцовасцей сапраўды добра размаўляюць на сваёй мове, так як дзетки з бельскай „тройкі".

Моладзь з Публічнай гімназіі ў Нарве пад кіраўніцтвам настаўніцы беларускай мовы Ніны Абрамюк паказала сцэнку „Юзэк і Зэнэк перад перапіваннем". Аўтарскія тэксты абапіраліся тут на народны абрад, а ўспамагаліся сучаснай музыкай на традыцыйныя словы. Хаця гэтае выступленне цяжка было назваць народным абрадам, то ўспрымалася яно з зацікаўленнем, асабліва малодшай публікай.

— Наш тэатр „Кабарэ" падрыхтаваў нестандартнае выступленне. Яно было адрасаванае перад усім да моладзі, але і да старэйшых людзей, — заявіла Ніна Абрамюк.

У час прэзентацый, наладжаных у Гайнаўцы Таварыствам беларускай культуры, Беларускім грамадска-культурным таварыствам і мясцовым домам культуры, была магчымасць запісваць выступы на відэакасету і на магнітафонную плёнку. Аднак для ўсіх выступаючых самым важным было выступленне перад публікай.

— Мы ў мінулым годзе выступалі з „Квашэннем капусты", а ў гэтым годзе гэты абрад прэзентуюць бельскія „Васілёчкі" (бялыпчане атрымалі гарачыя апладысменты; апякун Ніна Бялецкая — А. М.). Сцэнарый для абраду „Юр'е" падрыхтавала Валянціна Марціновіч з Краснага Сяла, якая выступае з намі, — сказаў Віталій Соха з Тапароў, які выступае з „Малінкамі", а гэты абрад рыхтаваўся пад наглядам кіраўніка калектыву Веры Нічыпарук.

„Малінкі" падрыхтавалі цікавую прэзентацыю з дэталямі, звяртаючы ўвагу на прымаўкі і іншыя адметнасці даўняга народнага абраду. Калектыў „Крыніца" з Беластока паказаў пад кірункам Вольгі Губар цікавы выступ „Як адпраўлялі ў армію", а з „Вячоркамі" ўдала выступілі пад наглядам Марыі Якімюк „Чыжавяне". Нашы беларускія калектывы наогул выступаюць з песнямі. Што тычыцца абрадавых сцэнак, найчасцей рыхтуюць адну ў год і выступаюць з ёй на абрадным восеньскім аглядзе, а пасля на летніх фэстах. Народныя спевы, якія спадарожнічалі абрадам, нашы акцёры ўспамінаюць з дэталямі. Стараюцца прэзентаваць таксама як мага дакладней прыказкі і іншыя народныя выказванні. Прыглянуўшыся дакладней да паасобных абрадаў, уражвае багацце народных прыёмаў, стваральнікамі якіх на працягу многіх стагоддзяў былі звычайныя людзі.

Бельскія „Жэўжыкі" выступілі з абрадам „Як то з ільном было"

— З якімі абрадамі мы і не выступалі. Людзі хочуць паглядзець на даўняе і маюць такую магчымасць, — сказала Люба Гаўрылюк з калектыву „Рэчанька" (Козлікі), якая разам з Алай Каменскай падрыхтавалі багатую прэзентацыю абраду „Перапіванне".

На гайнаўскае мерапрыемства найбольш прыйшло старэйшых людзей, якія яшчэ хадзілі на вячоркі, спявалі даўнія песні і трымаліся народных абрадаў. Аднак у глядзельнай зале можна было ўбачыць таксама асоб сярэднягa ўзросту і маладых.

МЗС Беларусі — беларускай дыяспары:
вы для нас па-ранейшаму замежнікі

Міністэрства замежных спраў Беларусі адказала на ліст МГА ЗБС „Бацькаўшчына", у якім быў дасланы Зварот, прыняты на 4-й канферэнцыі беларусаў Балтыйскага рэгіёна і Беларусі. Зварот у МЗС быў перададзены па просьбе Таварыства беларускай культуры ў Літве. У дакументе дэлегатамі канферэнцыі выказвалася просьба перагледзець кошты на візы для сваіх суайчыннікаў і па магчымасці зрабіць візы бясплатнымі. Такая ж просьба была агучана і на Пятым з'ездзе беларусаў свету МГА ЗБС „Бацькаўшчына" (ліпень 2009).

У адказ на гэты зварот Міністэрства замежных спраў праінфармавала „Бацькаўшчыну" пра тое, што ў адпаведных выпадках прадугледжаны і выкарыстоўваюцца на практыцы „так званыя «ільготныя» візы ў адносінах да замежных грамадзян, якія прадстаўляюць для беларускай дзяржавы інтарэс у розных галінах палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага жыцця".

Далей у лісце даводзіцца, што працэдура атрымання беларускіх віз замежнымі грамадзянамі простая і зразумелая, да таго ж жыхары Латвіі, Літвы, Польшчы і Эстоніі могуць атрымліваць візы тэрмінам дзеяння да 30 дзён без прадстаўлення запрашэння. А вось грамадзянам Беларусі для атрымання віз у згаданыя краіны неабходна сабраць ад 10 да 14 дакументаў.

Што тычыцца кошту віз, то, на думку беларускага МЗС, „тарыфы на выдачу беларускіх віз жыхарам Латвіі, Літвы, Польшчы і Эстоніі з'яўляюцца мінімальнымі", а далейшае спрашчэнне візавых працэдур магчымае „пры дасягненні адпаведных дамоўленасцей паміж Беларуссю і Еўрасаюзам".

Старшыня Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына" Ніна Шыдлоўская адзначыла: „З адказу Міністэрства замежных спраў вынікае, што беларусы замежжа, у тым ліку тыя, што працуюць на ніве беларушчыны ў краінах свайго пражывання, дагэтуль нашай дзяржавай цалкам прыраўноўваюцца да іншаземцаў. І мы зноў упіраемся ў адсутнасць закону аб беларусах замежжа. У лісце размова ідзе пра агульную працэдуру атрымання віз замежнымі грамадзянамі, і абсалютна не ўлічваецца, што і на Пятым з'ездзе беларусаў свету, і ў Звароце дэлегатаў канферэнцыі беларусаў Балтыйскага рэгіёна вядзецца гаворка пра кошт віз менавіта для беларусаў, якія пражываюць за мяжой, — велізарны патэнцыял для Беларусі. Натуральна, мы зацікаўлены ў спрашчэнні візавай працэдуры і танных шэнгенскіх візах для ўсіх грамадзян Беларусі, але гэтыя два пытанні трэба разглядаць асобна. Менавіта беларуская дзяржава мусіць клапаціцца пра сваіх суайчыннікаў у замежжы, і ў дадзеным выпадку палітыка Еўрасаюза не мае да гэтага ніякага дачынення".

У тым жа лісце МЗС адказала і на просьбу „Бацькаўшчыны" аб прадстаўленні бясплатных шматразовых візаў сябрам Вялікай Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына" — кіраўнікам беларускіх суполак у замежжы. „МЗС арыентавала адпаведныя замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь адносна афармлення кароткачасовых віз для наведвання краіны сябрамі Вялікай Рады МГА Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына", — гаворыцца ў лісце. Інфармацыі пра тое, ці будуць візы бясплатнымі, у лісце няма. У тэлефоннай размове прадстаўнік МЗС паведаміў, што пытанне кошту і тое, якімі будуць візы — шматразовымі ці аднаразовымі, будуць вырашаць самі замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь у краінах пражывання сяброў Рады. Наколькі гэтае рашэнне дасць палёгку кіраўнікам беларускіх суполак замежжа, застаецца пытаннем.

Інфармацыйны цэнтр МГА ЗБС „Бацькаўшчына"
23.11.2009 г.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Маладыя ўмеюць па-беларуску

Калі ў аўторак, 17 лістапада, пад'язджаю пад школу ў Орлі, яе знешні выгляд не паказвае нейкіх нетыпічных рысаў. Што ж, будынак школы, побач яго машыны і гэта ўсё. Але калі набліжаюся да ўвахода, чую гучныя беларускія спевы. У Комплексе школ у Орлі праходзіць якраз IV Дзень беларускай культуры.

— Сярод вучняў вылучыць можам тры групы дзяцей, — тлумачыць дырэктар Комплексу школ у Орлі Дарыюш Гарадэцкі. — Першая — свядомыя беларусы, якія ўдзельнічаюць у занятках беларускай мовы. Другая група — гэта прадстаўнікі іншых нацый, якія павінны пазнаць культуру сваіх суседзяў. І трэцяя група — гэта дзеці, у якіх, несумненна, беларускае паходжанне, але не наведваюць яны ўрокаў роднай мовы. Ім таксама хочам паказаць беларускую культуру.

http://www.orla.szkola.pl

І фактычна, падчас беларускага дня ў Орлі вучням прапанаваліся многія атракцыёны. Найбольш відавочнай была тэатральная частка. Пачалі яе вучні пачатковай школы. Публіцы прадстаўляецца гурт „1/3" ды тэатральная група „Байка".

— Мы любім выступаць, асабліва на конкурсах, — гаворыць Магдаліна Шайкоўская, вучаніца 6 класа, якая выступала ў тэатральнай пастаноўцы. — Спектакль рыхтавалі мы доўга і, апрача конкурсу, пажадалі паказаць яго таксама тут.

У п'есе выступіла Кацярына Куптэль з 5 класа, якая на сцэне спявала беларускія песні.

— Вельмі люблю спяваць, — прызнаецца Кася, — на беларускай і польскай мовах.

На пытанне ці такі беларускі дзень у школе патрэбны, вучаніцы згодна прызнаюць: так.

— Мы можам паказаць тут свае таленты і даказаць, што ўмеем гаварыць па-беларуску, — тлумачыць Магда Шайкоўская. — Усе думаюць, што маладыя не ўмеюць гаварыць, а гэта няпраўда.

Ахвоту вучняў да выступленняў на беларускай мове пацвярджае настаўніца пачатковага навучання Ала Зінкевіч, якая рыхтавала п'есу.

— Дзеці вельмі хочуць выступаць на сцэне, знаходзяць на ёй сваё месца, — тлумачыць настаўніца.

Тэатральная частка Дня беларускай культуры ў Орлі накіраваная была таксама да гімназістаў. У якасці запрошаных гасцей са сваёй пастаноўкай выступілі вучні гімназіі ў Нарве, якіх падрыхтавала настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк.

— Мы прыехалі ў Орлю, каб пабачыць як тут маюцца справы, — гаворыць адна з нарваўскіх гімназістак. — Хочацца таксама пазнаць людзей адсюль, наладзіць знаёмсты.

Выступленне тэатральнай групы з Нарвы выклікала ўсмешку на тварах публікі, бо ў ім многа іроніі ды гумару.

Беларускі дзень у школе ў Орлі гэта не толькі тэатральная частка, але і іншыя беларускія мерапрыемствы.

— У зале падоўжанага дня настаўнікі чытаюць дзецям беларускія казкі, — гаворыць дырэктар Дарыюш Гарадэцкі. — Можна таксама паглядзець выстаўку мастацкіх прац вучняў, якія прынялі ўдзел у конкурсе „Прырода ў паэзіі паэтаў-„белавежцаў".

Свята беларускай культуры ў школе бачнае таксама і ў сталовай, якая прапанавала беларускія стравы.

Як кожнае свята, так і беларускі дзень у школе ў Орлі хутка набліжаецца да заканчэння. Сёлетняе мерапрыемства — ужо чацвёртае па ліку. Спадзяемся, што праз год V Дзень беларускай культуры ў Орлі пройдзе ў яшчэ больш святочнай атмасферы.

Міхась СЦЕПАНЮК

Галерэя Зоркі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Куба Ваўрусевіч

2. Твой любімы прадмет: музыка.

3. У жыцці хачу стаць: ветэрынарам.

4. У сяброў цаню: вернасць, каб заўсёды гаварылі праўду.

5. Не люблю: калі б'юцца, дакучаюць сябрам.

6. Па-беларуску размаўляю: часам з мамай і часам з бабуляй (на гаворцы), а таксама на ўроках беларускай мовы.

7. Кніжка, якая мяне захапіла: „Жыццё марской свінкі".

8. Падабаецца мне музыка: беларуская і руская.

9. Люблю размаўляць з: сябрамі.

10. У „Зорцы" падабаецца мне: апавяданні і польска-беларуская крыжаванка.

11. Чаму: бо калі рашаю крыжаванкі, то не толькі вучуся, але і гуляю.

Артур Вольскі

Сталяры

Мы са Слаўкам —
сталяры:
робім лаўку
на двары.

Жоўтыя апілкі
сыплюцца
з-пад пілкі.
Стружкі
з-пад рубанкаў —
вязкай абаранкаў.

Мы для лаўкі
дошкі
падгаблюем трошкі.
Вось гатова спінка.
Вось гатовы ножкі.

Тук-так-ток,
тук-так-ток, —
заспяваў малаток.
Ды чамусьці
цвікі
загінаюцца
ў бакі.
Выпраміш —
і зноўку
хіліць цвік галоўку.
Аж да стомы
працавалі,
але лаўку
змайстравалі.

Мы абодва
рады надта,
ды прыйшла сястрычка
Ната.
Паглядзела
і сказала:
— З вашай працы
толку мала.
Нават боязна садзіцца.
Можа лаўка
разваліцца...

Я ў адказ:
— Наадварот!
Прастаіць яна сто год...
Ната зноў:
— Ну што ж,
паглядзім...
Я — да Слаўкі:
— Сядзем?
— Сядзем!

Я саджуся.
Сеў і Слаўка...
Нас дваіх
трымае лаўка.

— Во, — кажу я
да сястры, —
мы са Слаўкам —
сталяры!

Збуч (2)

У чарговай частцы нашых падляшскіх вандровак працягваем знаёмства з вёскай Збуч, што ў Чыжоўскай гміне. Мінулым разам наведалі мы гарадзішча „Акопы", а зараз — старажытны могільнік „Грабняк".

Каб трапіць у „Грабняк", трэба ў палове дарогі паміж Збучом і Чыжамі павярнуць у палявую дарогу, якая вядзе ў аддалены на некалькі соцень метраў аднайменны лес. Якраз тут знаходзіцца раннесярэднявечны могільнік з курганамі і магіламі ў каменных абставах з X-XII ст.ст. — адзін з найцікавейшых археалагічных аб'ектаў на Падляшшы.

Гэты раён упершыню даследавалі ўжо у 1856-1872 гг. Могільнік вывучаў прафесар Віленскага ўніверсітэта Юзаф Ярашэвіч — выдатная постаць у гісторыі Бельска-Падляшскага і ўсяго Падляшша. У час даследаў, у адным з курганоў знайшоў ён некалькі шкілетаў, а ў іншым — косці чалавека і сякеру. Гэта можа сведчыць, што быў тут пахаваны выдатны ваяўнік. Апрача гэтага, Ярашэвіч наткнуўся тут на шматлікія цвікі, медныя бранзалеты, шкляныя пацеркі, сярэбраныя вешалкі і кераміку.

Вусныя аповеды жыхароў Збуча сведчаць, што назва вёскі ўзялася ад прозвішча Збуцкі — аднаго з трох гаспадароў, пражываўшых на гэтай зямлі. Паводле другой версіі „Збуч" — гэта іначай „буч". У ваколіцах вёскі было шмат букавых гаяў.

Першае вядомае апісанне вёскі датуецца 1556 годам, калі належала яна да Вялікага Княства Літоўскага. Згодна апісанню вёска была цэнтрам вайтоўства, якое ахоплівала чатыры мясцовасці: Беразова, Мора, Махнатае і Збуч.

Збуч размешчаны быў на 20 валоках зямлі. У вёсцы дзейнічала карчма.

Войны палавіны XVII стагоддзя знішчылі Збуч. У чарговыя стагоддзі вёску чакалі, на жаль, наступныя няшчасці.

У 1915 годзе падчас бежанства перад нямецкімі войскамі жыхары Збуча падаліся ў глыб Расіі. Дарэчы, у вёсцы застаўся толькі адзін пажылы гаспадар. Вяртанні з бежанства пачаліся ў 1918 годзе.

Цяпер у Збучы большасць дамоў драўляная. Многія аздоблены карункавымі ліштвамі над вокнамі і на вуглах. Самыя старыя хаты былі пабудаваны перад Другой сусветнай вайной. Цікавым прыкладам аздаблення можа быць узведзены ў 1931 годзе самы вялікі ў вёсцы дом № 24. Аздобы на ім былі выкананы ў 1934 г. чыжоўскім цеслем.

Міхась СЦЕПАНЮК

Конкурс ведаў пра Яраслава Кастыцэвіча

завяршыўся 25 лістапада г.г. У час урачыстага падвядзення вынікаў, на які арганізатары запрасілі сяброў і спонсараў ідэі, усе вучні атрымалі ганаровыя граматы, а пераможцы — кніжныя ўзнагароды.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Паколькі амаль усе ўдзельнікі конкурсу з'яўляюцца чытачамі „Зоркі", мы з прыемнасцю прадставім поўны спісак пераможцаў. У папярэднім нумары мы надрукавалі прозвішчы лаўрэатаў першых месцаў, зараз — другіх і трэціх.

У катэгорыі класаў IV-VI:

Другое месца занялі Якуб Шымонюк, Міраслава Дзмітрук, Малгажата Шчужэўская, Якуб Ваўрусевіч — усе з класа IV „б", Наталля Томчык з IV „д", Кароль Аніськевіч з V„а".

Трэцяе месца: Дыяна Клімчук, Тамаш Грыгарук, Шыман Пэтлінскі з IV „б", Адрыян Ткачук, Кацярына Шэфлер, Сільвія Якубоўская з IV „ц", Мацей Ваўжэнюк з IV „а", Юліта Подолец і Данель Цэтра з IV „д".

У катэгорыі гімназія:

Другое месца: Аня Кірылюк, Павел Буйнюк з II „а", Кшысь Пашкоўскі, Пётр Шымчук з II „б".

Трэцяе месца: Моніка Гвоздзей, Лукаш Артэмюк з II „б", Кася Старчэўская з II „а", Марыюш Артэмюк з I „а".

Музыка з кайфам

Музычныя гонкі?

„Колькі песень змесціцца ў пяцігадзінным канцэрце?" — запытаўся гурт „Дзеціздзяцей" сваіх фанатаў ды тых, якія з цікавасці збіраліся на канцэрт 24 лістапада ў мінскі клуб „Рэактар". Складана адгадаць, бо песні гэтага гурту вельмі розныя па даўжыні, думаю, што нават знайшліся б у рэпертуары такія кароценькія, хвілінныя-паўтарахвілінныя заяўкі песень. І як тут адгадаць? Але прынамсі ёсць гульня, выклік і хочацца ўваходзіць з гуртом у віртуальную размову. Дарэчы, пяць гадзін канцэрта ўжо здзіўляе і здаецца вялікім выклікам для саміх выканаўцаў. Шкада толькі, што гэта не пяць гадзін на беларускай мове толькі і выключна — гэта была б задача! Але не ў тым справа. Натхнёная гэтай падзеяй, я хутка зайшла на сайт гурту „Нейра Дзюбель", які таксама ў лістападзе святкаваў свой дваццацігадовы юбілей. „Усе ў „Рэактар"! Канцэрт будзе запісвацца і здымацца на камеру", — заклікаў, здавалася, сам Аляксандр Кулінковіч, лідар гурту „НД". З нагоды юбілею гурт плануе выдаць альбом CD і DVD — гэта якраз папулярная практыка. Але гляджу далей, а там спісак песень, якія мелі б паявіцца ў час канцэрта, амаль пяцьдзесят кампазіцый! Падумайце толькі, амаль як на вяселлі! Чарговы рэкорд плануюць? Ну, можа не рэкорд, але

Аляксандр Кулінковіч „Рок-каранацыя 98"

http://neurodubel.com

напэўна сапраўднае свята. „Нейра Дзюбель" вельмі адданы сваім слухачам і не шкада здароўя для іх (нашай) прыемнасці. Можам толькі зайздросціць тым, якія на канцэрце пабывалі, бо Аляксандр кожны раз у час выступу выглядае як бы душу прадаваў (не скажу каму), каб адчуваць усе эмоцыі свету! Га, нялёгкая штука!

Варта дадаць, што гэты год вельмі багаты для беларускай музыкі. Свае юбілеі, апрача „Нейра Дзюбеля", адзначаюць між іншымі гурты :Б:Н: (10), „Тройца" (10) ці „Н.Р.М." (15). Гэта, думаю, светлая варажба для іншых музыкаў, якія змагаюцца за чарговы месяц ці год дзейнасці. Не апускайце рук! Хацець — значыць магчы!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 45:

Кок, кола, капялюш, шалік, явар, смак, грыва. Як, госці, каштан, копа, ляля, каліва, юка, кош, ружа.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі **Віялета Рушук** з Новага Корніна, **Івона Анішчук** з Дубін, **Юстына Вакулюк** з Арэшкава, **Сэбастыян Верамеюк, Паўліна Паплаўская, Габрыель Кузьміч, Кацярына Туроўская, Кацярына Дзержаноўская, Вольга Хвашчэўская** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Усе мы Твой вялікі клас

Аліне Ваўранюк
у 45 гадоў з дня нараджэння

Ты Юбілярка сёння ў нас.
Прымі ад сэрца віншаванні!
Усе мы, Твой вялікі клас,
Цябе шануем мы дазвання.

А колькі ж у Табе надзей
У навучанні паспяховым!
Ад непісьменнасці дзяцей
Ратуеш Ты у роднай мове.

Дзеткі развучваюць з Табой
Многа сцэнічных розных твораў,
Так ачароўваюць ігрой,
Як прафесійныя акцёры.

Трэба сказаць: экскурсавод
Надзвычай добры Ты таксама.
Праводзіш выезды штогод
У Беларусь — дзяцей з бацькамі.

І беларускі наш фальклор,
Частку знікаючых абрадаў,
Каб канчаткова не памёр —
Яго кіруеш на эстрады.

Магутны надта голас Твой,
Ён песні нашы ўзбагачае,
А разам ад душы з Табой
Моладзь, дарослыя спяваюць.

Жыві, Аліна, сто гадоў!
Вучы, пішы, спявай заўсёды!
Да роднага ўздымай любоў!
Працуй далей у карысць народу!

Віктар ШВЕД
Беласток, 29 лістапада 2009 г.

Дзмітры Шатыловіч — феномен „Белавежы”

З Дзмітрым Шатыловічам пазнаёміўся я ў 1946 годзе, калі ён, дэмабілізаваны з Чырвонай Арміі, вярнуўся на радзіму і пачаў вучыцца ў беларускай школе ў Бельску-Падляшскім. У школьнай насценгазеце змяшчалі мы свае юнацкія вершы.

У 1948 годзе мой сябра Дзіма выехаў у Ленінград, дзе закончыў Электратэхнічны інстытут. Атрымаў працу ў праектным бюро Міністэрства энергетыкі ў Варшаве, якое планавала пабудову электрастанцый у Коніне, Тураве і Пантнове.

Уладкаваўся ён на кватэру ў блоку па вуліцы Лавіцкай у Варшаве, у якім і я жыў з сям’ёю. Ад гэтага часу мы сустракаліся вельмі часта.

Дзмітры Шатыловіч з’ўляецца настолькі працавітым чалавекам, што нават свае водпускі выкарыстоўваў як гід — прафесійны праваднік замежных экскурсій. А да таго яшчэ ў другой палове 1980-х гадоў быў накіраваны Міністэрствам энергетыкі на працу ў Індыю, дзе Польшча рэалізоўвала энергетычныя кантракты.

Таленавіты паэт меў вельмі мала часу на літаратурную дзейнасць. Таму нічога дзіўнага, што яго паэтычныя кніжкі пачалі паяўляцца толькі ў дзевяностыя гады мінулага стагоддзя, калі паэт перайшоў на пенсію і поўнасцю прысвяціў сябе паэтычнай працы. Дагэтуль паявілася 11 паэтычных кніжак Дзмітрыя Шатыловіча. Апошняй, нядаўна выдадзенай, з’яўляецца зборнік „Подыхі хвілін”. Дзякуючы сваёй выключнай працавітасці, паэт, выдаючы штогод на ўласны кошт свае паэтычныя зборнікі, паважна ўзбагаціў Бібліятэку „Белавежы”.

Ганаруся тым, што я з’яўляюся рэдактарам і карэктарам аж дзесяці выдадзеных Шатыловічам паэтычных кніжак і таму хіба найлепш ведаю яго паэтычную творчасць. Узяўся я за гэтую працу таму, што паэзія майго сардэчнага друга вельмі блізкая майму сэрцу. Многа ў нас супольнага, асабліва тое, што ў роўнай меры клапоцімся штодзённым жыццём беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, лёсам беларускай мовы на Беласточчыне, а таксама ў Рэспубліцы Беларусь. Аднак не згаджаемся з Дзімам з меркаваннем нашага добрага калегі Алеся Барскага, які, пішучы аб творчасці Шатыловіча ў сваёй кніжцы „Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы 1958-1998”, сцвердзіў: „Падабенства з Віктарам Шведам настолькі вялікае, што многія вершы Дзмітрыя Шатыловіча, пазбаўленыя прозвішча аўтара, былі б, праўдападобна, прыпісаны літаратурнымі крытыкамі Віктару Шведу”. Адрозніваемся мы ў сваёй творчай манеры хаця б тым, што я пішу вершы ў кароткай форме, калі мой сябра Дзіма любіць маляваць шырокія палотны.

Дзмітры Шатыловіч толькі тры гады вывучаў у школе беларускую мову. Таму ён самастойна пастаянна шліфуе мову. І, зразумела, атрымліваюцца добрыя вынікі гэтай працы.

Тэматычная структура паэтычных зборнікаў Шатыловіча больш-менш падобная: вершы-ўспаміны з дзіцячых і юнацкіх гадоў, сённяшні побыт беларускага насельніцтва Падляшша, захапленне роднай прыродай, рэфлексіі над людскім існаваннем і — што асабліва цікавае — фенаменальныя штрыхі са старажытнай гісторыі Беларусі, чаго не знойдзем у іншых „белавежцаў”.

Вось так гучаць радкі вершаў, апісваючых жыццё сялян даваеннай роднай вёскі Чаромхі, у апошнім паэтычным зборніку „Подыхі хвілін”:

У хатах я часта не бачыў падлогі,
А толькі гліняны патрэсканы ток...
У хатах я рэдка пабачыў дзесь ложак,
Раскладвалі дошкі, на дошках сяннік...
(У сне бачу родную вёску)

Усюды хадзілі сяляне
У цёплыя дні басанож,
А ў лапцях па снежным дыване
І восенню ў буру і дождж.
(Даваеннае пакаленне)

А так успамінае аўтар свой ваенны лёс:

Прагнаў мяне ў далёкую чужыну
І змусіў жыць паміж чужых людзей
І ў моцную няволі кажурыну
Папасці ў безнадзейны час падзей...
(Выгнанне з айчыны)

Ад прымусовай працы ў Нямеччыне паэта вызваліла Чырвоная Армія:

І замест вольнасці прыйшла няволя,
Мы горшыя пачулі кайданы...
Паслалі многіх на вайну з вінтоўкай,
Ды гінулі ад куль і ад хвароб.
(Расчараванне)

Цяжка параненага на фронце пасля вылячэння не адпусцілі дахаты:

І з Аляштайна я пайшоў у Вільню,
А з Вільні ў Менск і пад Бабруйск у вёску.
Прабыўшы там салдацкую курыльню,
Закончыў службу я ў савецкім войску.
(Мой „дзень перамогі”)

Паэт вяртаецца на радзіму:

Як фенікс ажыла Варшава,
Цягнула вуліцы, як стужкі,
І праз гады я вельмі жвава
Стварыў гняздо ў ёй, быццам птушка.
(Варшава)

У зборніку знайшлося шмат цікавых вершаў прыродаапісальнага характару. Адзін з іх — „На Івана Купалы”, перададзены да апрацоўкі на музыку і неўзабаве стане песняй.

Асаблівую ўвагу варта звярнуць на апошні раздзел кніжкі „Подыхі гісторыі”. Аўтар у вершаванай форме прадставіў фрагменты старажытнай гісторыі Беларусі, усхваляючы вялікага князя Міндоўга, княгіню Аляксандру Брачыслаўну і князёўны Сафію Гальшанскую, Ганну Кобрынскую і Анастасію Алелькавічанку.

Хачу закончыць свае разважанні фрагментам верша „Праца”:

Праца ў жыцці мне памагае
Зрабіць маленькі след на свеце,
Які я ў кніжках астаўляю
Усім знаёмым на планеце.

Варта дадаць, што не толькі знаёмым.

Віктар ШВЕД

Каб і мы мелі свой беларускі Спадарожнік...

У час апошняй „Бардаўскай восені” сядзелі мы аднойчы пры ранняй каве супольна з Міхалам Анемпадыставым. Гутарка як заўсёды завяла нас у Беларусь, але вандравала таксама па завулках польскай культуры, з якой Міша сутыкнуўся ў час паўгадовай стыпендыі ў Польшчы. „Пазнавалі мы польскае асяроддзе людзей звязаных з культурай, асобы прызнаваныя аўтарытэтамі, механізмы функцыянавання польскай культуры” — тлумачыў ідэю стыпендыі Міхал. Шырокае культурнае поле дыскусіі абмежавалі мы нечакана да тэмы кіно. Міхал, як і я ды большасць людзей, якія цікавяцца беларускай культурай, схіляецца да погляду, што ў Беларусі сучаснага кіно няма, прынамсі ў афіцыйнай плыні. Можа не было б гэта так балючае, каб не зацікаўленне ў Польшчы расійскім кіно. Усходняя кінематаграфія зараз абмяжоўваецца ў асноўным да „вялікага рускага кіно”! Але зараз няма тут нават і над чым здзекавацца, бо, пачынаючы з такіх майстроў як Дзіга Вертаў (дарэчы, родам з Беластока) ці Андрэй Таркоўскі даходзім да сучаснага, паўнавартаснага кіно, якое ў Польшчы вырашылі паказваць між іншым на вялікамаштабным фестывалі „Спадарожнік над Польшчай”. Першы такі фестываль нясмела прайшоў у 2007 годзе, але ўжо тады, як пішуць у афіцыйным лісце арганізатары, зацікаўленне перарасло спадзяванні. Самае цікавае, што ініцыятыва папулярызацыі расійскага кіно ў краіне над Віслай прыйшла на думку фонду „Падтрымліваем” пасля паспяховых прэзентацый экспартнага тавару Расіі ў выглядзе „Хору Аляксандрава” ці „Бярозкі”. Мерай папулярнасці гэтых гуртоў можа быць зусім неспадзяваны, а нават абсурдны выступ „Хору Аляксандрава” ў адным з найбольш паспяховых тэлевізійных шоў польскага тэлебачання „Адгадай мелодыю”. Адным словам, лавіна поп-культуры вельмі лёгка ўсмоктвае невытлумачальныя цуды мастацтва.

Кіно гэта ўжо іншая ліга. „Хаця разумею вартасць расійскага кіно, — працягвае гутарку Міхал Анемпадыстаў, — то шакіруючым для мяне была яго папулярнасць у Польшчы. Менавіта тут пачаў я пазнаваць яго сучасны твар”. Сучасная Беларусь затое жыве кінаматаграфіяй з неўміручай савецкай рысай і цяжка гэта неяк пераадолець. Штораз з’яўляюцца такія творцы, як Андрэй Кудзіненка, якія быццам адзінокія змагары хочуць выпраміць гісторыю або паказаць новы погляд на кіно, але большую папулярнасць здабываюць дзесьці на захад ад Беларусі. Чарговую ідэйную спробу ажыццяўлення беларускага кіно падняў Антось Цялежнікаў, таксама ў Польшчы. Беларускі эмігрант у Варшаве, які апошнім часам маршы са сцягом памяняў на працу з камерай. Фільм пра нямецкую акупацыю Беларусі зняў ён пры дапамозе тэлеканала „Белсат”. „Белсат”, дарэчы, адкрыў многія сцяжынкі магчымасцей для старэйшых і маладых адкрытых творцаў. Шматлікія фільмы ездзяць па фестывалях і прывозяць узнагароды. Патэнцыял ёсць, але няма добрай волі і сістэмы, якая дапамагла б у Беларусі развіваць сучаснае кіно. Нягледзячы на тое, у асноўным маладыя людзі пры дапамозе камп’ютараў рэалізуюць свае творчыя планы, чацвёра з іх свае фільмы пакажа ў рамках беластоцкага фестывалю „ŻubrOFFka”, які пройдзе з 3 да 6 снежня 2009 г. у Беластоку. „Акно на Усход”, бо так называецца конкурс для творцаў з усходняй Еўропы, пакажа як на фоне ўкраінскай ці расейскай фільмавай альтэрнатывы прэзентуюцца пазбаўленыя мастацкіх комплексаў беларусы. А мы, гледачы, мабыць пакарыстаемся гэтай нагодай і наша веданне ўсходняга кіно не будзе абмяжоўвацца да Мікіты Міхалкова ці фільмаў, якія можна было пабачыць і ў Беластоку ў рамках вельмі папулярнага ўжо сёння фестывалю „Спадарожнік над Польшчай”.

Ілона КАРПЮК

Вайна і лёс чалавека

70 гадоў таму назад распачалася Другая сусветная вайна. У свядомасці грамадскасці яна паўстае маштабнасцю бітваў, геніяльнай стратэгіяй палкаводцаў, мужнасцю салдат, нязлічанай колькасцю загінуўшых. Апошняе, жахлівыя лічбы нікому непатрэбнай чалавечай бойні. Аднак амаль ніхто не распавядае пра зламаныя лёсы мільёнаў і мільёнаў простых людзей, якія жылі з працы, мелі сем'і, гадавалі дзяцей і жадалі мірнага жыцця. Як прыклад таму, лёс майго дзядзькі Баляслава Сарокі. Ён выпрабоўваў гэтага чалавека шмат разоў.

Першае выпрабаванне адбылося ў 1939 г. Да гэтага часу Баляслаў жыў на хутары разам з братамі Людвікам, Янкам і сястрой Броняй — маёй маці. Бацькі памерлі рана, таму ўсю гаспадарку вялі дзеці, з чаго і жылі. На пачатку нямецка-польскай вайны Баляслава, як рэзервіста, прызвалі ў войска. Іх артылерыйскі полк знаходзіўся ля Брэста. Баляслаў быў зараджаючым. Сцякаюць кроўю абаронцы Варшавы і жаўнеры мелі непахіснае жаданне ісці ім на дапамогу. Загаду няма. Толькі кожнаму з іх камандзіры наказалі адкапаць свой шанец. Нечакана з усходу наступ распачала Чырвоная Армія. Несупынна на пазіцыі палка савецкая авіяцыя раскідала ўлёткі. У іх было напісана: „Браты! Ідзём дапамагаць вам біць немца". Жаўнеры паверылі. Спадзяваліся, што так будзе. Па акупантах з усходу не зрабілі ні аднаго стрэлу. Здалі зброю. „Братоў" адразу ў калону і пагналі на чыгуначную станцыю. Збоку абозу сабакі і канваіры з вінтоўкамі. Зняволеныя. Пасадзілі ў „цялячыя" вагоны і павезлі. Ніхто ім не патлумачыў — куды. Праз тыдзень палонных прывезлі пад Харкаў. Так яны апынуліся ў знакамітым, як Катынь, савецкім канцлагеры для палонных Войска Польскага. Адразу за калючы дрот. На вышках паставыя з кулямётамі, вакол агароджы ходзяць патрульныя з сабакамі. Падыходзіш да дроту: „Стой! Страляць буду!" Тут людзі зразумелі, што яны не палонныя, а вязні. Ежы ніякай. Елі сырую бручку. Праз тыдзень сталі адыходзіць кроўю. Дваццацігадовыя хлопцы пачалі паміраць, як старэчы. Ранкам 3-5 чалавек нежывыя. Дзе іх хавалі — невядома. Каб уратаваць жыццё, узнікла жаданне збегчы з гэтага пекла. Баляслава падтрымаў яго камандзір падхарунжы Войтак з Вільні. Да іх далучыліся яшчэ чатыры вязні. Вечарам, калі змяняліся паставыя, сіганулі пад дрот. Вартавы з адной вышкі заўважыў пабег і адкрыў страляніну. Уцекачы ўжо паспелі дабегчы да кустоў і тым выратавалі сваё жыццё. Далей яны, знясіленыя, беглі болей як гадзіну часу. Калі адчулі, што нямa пагоні, спыніліся на адпачынак. Два жаўнеры з пяхоты, мазуры, вырашылі ісці дамоў праз Румынію. Два іншыя ўцекачы таксама выбралі свой шлях.

Далей ішлі ўдвух: Баляслаў і яго камандзір. Ішлі пешшу. Абміналі гарады Роўна, Цярнопаль, Ковель, Луцк. Пад Луцкам для іх адбыўся цуд. Два тыдні жылі ў аднаго гаспадара. Ён даў магчымасць ім адпачыць, забяспечыў ежай і перааправіў, бо да гэтага часу ішлі ў вайсковай форме. Семнаццацігадовая дачка гаспадара ўпадабала Баляслава і прасіла яго застацца, але жаданне вярнуцца на Бацькаўшчыну перамагло. Уцекачы пайшлі далей. Не ўсе так прыязна ставіліся да іх. Каб здабыць нават кавалак хлеба, хтосьці з іх забягаў у хату, пытаў нешта паесці і збягаў. Хто даваў, хто не. Пад Брэстам адзін гаспадар, калі запыталі яго пра шлях, накіраваў іх на НКУСаўскі гарнізон. У самым Брэсце таксама былі непрыемнасці. На базары іх спрабаваў затрымаць патруль, але яны ўцяклі і схаваліся пад прылаўкі, дзе іх спадніцамі і кашамі прыкрылі гандляркі. У гэты ж дзень падобная сітуацыя з імі адбылася на чыгуначным вакзале. Ад пераследу патруля рабочыя, якія рызыкавалі сваім жыццём, схавалі іх у вагон. Праз шчыліну ў дзвярах яны бачылі, як гадзіну часу чэкісты, наставіўшы ў твар пісталет, пыталі тых: „Дзе ўцекачы?". Ноччу чыгуначнікі, якіх меліся забіць НКУСаўцы, прынеслі паесці і пасадзілі ў цягнік, што ішоў да Беластока. Да Гродна дабіраліся пешшу і тут разышліся: падхарунжы пайшоў да Вільні, Баляслаў на Мастоўшчыну. Каб не заблукаць, ішоў каляёю. За тры кіламетры ад хаты яго спыняе патруль Чырвонай Арміі. „Кто такой?" — „Чыгуначнік". Сяржант здымае вінтоўку з пляча, але тут радавы кажа: „Видишь, рабочий! Пускай идет!". Так вярнуўся дамоў да звыклага жыцця, хоць родныя ўжо не спадзяваліся бачыць Баляслава жывым і нават адслужылі імшу за спачын душы.

Чарговая расейска-германская вайна на пачатку абмінула Баляслава. Немцы акупавалі Гарадзеншчыну ў большасці за тры дні і таму яго не паспелі прызваць у савецкае войска. Новыя ўлады патрабавалі новых стасункаў, але нягледзячы на гэта ішоў унармаваны лад жыцця. Доўжылася тое нядоўга. Лёс і абставіны не заставілі сябе чакаць. Наканаванае чарговае выпрабаванне жыццём распачалося напрыканцы 1943 г. Якраз на Каляды. Павячэралі, ляглі спаць. У акно пастукалі. Як адчынілі дзверы, то пабачылі не менш як дзесятак немцаў. „Што такое?" — губляліся людзі ў дагадках, бо не ведалі, што ў аднаго вяскоўца немцы пад чоўнам знайшлі абрэз і ён, каб выратаваць жыццё, абгаварыў каля двух дзесяткаў вяскоўцаў. Распачаўся вобыск. У хаце нічога не знайшлі, не знайшлі ў хляве і гумне. І толькі ў адным з вулляў адшукалі абрэз. Гэтага было дастаткова, каб арыштаваць Баляслава і Людвіка. Янак уратаваўся тым, што адсутнічаў дома. У Людвіка была ўжо сям'я і двое маленькіх дзетак. Амаль два дзесяткі вяскоўцаў апынуліся ў Ваўкавыскай турме, як партызаны. Не пазбег арышту і той, хто на іх нагаварыў. Немцы наўмысна яго памясцілі ў адну камеру з аднавяскоўцамі і тыя над ім учынілі самасуд — збілі да смерці. І іх немцы таксама білі. Найбольш пацярпеў Людвік. Пасля другога допыту стаў мачыцца кроўю. Напрыканцы следчы сказаў братам: „Ведаю, што невіноўныя, але нічога зрабіць не магу". Пасля ўсіх накіравалі ў канцлагер пад Данцыгам. Калі распачала наступ савецкая армія, лагер эвакуіравалі. Вязняў калонамі пагналі ў глыб Германіі. Браты трапілі ў розныя калоны. Калі калоны злучылі, Людвіка не аказалася. Ён быў знясілены і верагодней за ўсё ўпаў. Такіх немцы звычайна прыстрэльвалі.

Пасля вайны Баляслаў меў непахіснае жаданне вярнуцца дамоў, але яго Радзіма стала часткай Савецкага Саюза. Перасцярога, што будзе арыштаваны, як уцякач з канцлагера ў 1939 г., не дазволіла здзейсніць гэта. Застаўся ў Польшчы, хоць гэта была ўжо іншая Польшча і тое ён зразумеў вельмі хутка. Спыніўся ў Беластоку. Працаваў на чыгунцы. Быт і дабрабыт паступова наладжваўся. Паўстала звыклае мірнае жыццё. Доўжылася тое толькі чатыры гады. У 1949 г. да яго завіталі супрацоўнікі УБ. „Ты арыштаваны!" — „За што?" — „Быў у Арміі Краёвай, ваяваў супраць Арміі Людовай". „Не быў я ні ў якіх арміях". Пісталет у скроні. „Кажы што хочаш, напішам, што трэба". Чалавек, які прайшоў сталінскія і гітлераўскія канцлагеры, праз трыццаць гадоў з жахам успамінаў тыя катаванні: як падвешвалі за ногі да столі і трымалі так гадзінамі, як пазрывалі пазногці з трох пальцаў, а яшчэ мужчынскую годнасць зацiскалі шуфлядаю. Не прызнаў ніякіх абвінавачванняў, але следчыя напісалі што трэба. Суд. Смяротны вырак. У іх камеры ўсе мелі смяротнае пакаранне. Штоноч дзверы яе адчыняліся і кагосьці выводзілі, але той чалавек ужо не вяртаўся. Два прашэнні аб літасці былі адхілены, пасля трэцяга прашэння смяротны вырак змянілі на дзесяць гадоў турмы. Сядзеў у вязніцы восем гадоў і дзевяць месяцаў, а не ўвесь тэрмін і то дзякуючы таму, што лёс нечакана паспрыяў яму. Аб тым, што сталася з Баляславам даведаўся яго сябра і аднавясковец Бронік, які гэтаксама быў арыштаваны ў 1943 г. немцамі, але ўцёк з лагера, далучыўся да польскіх партызан, ваяваў ды меў шмат узнагарод ад польскай дзяржавы. Каб уратаваць вяскоўца, ён звяртаўся ў Сейм, да ўрада, у іншыя інстанцыі. Праз некаторы час Баляслаў выйшаў на волю. З'ехаў з Беласточчыны, далей ад Бацькаўшчыны. Пасяліўся ў горадзе Хэлмэк, што за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад жахлівавядомага Асвенціма. Зноў займеў звыклы лад жыцця, урэшце сям'ю. Выгадаваў дзве дачкі і сына, які ў 1980-я гады стаў самым актыўным сябрам мясцовага аддзялення „Салідарнасці" — супраціву тутэйшым камуністам. Толькі калі Польшча стала адраджаць дэмакратыю, а Савецкі Саюз у стасунках між людзьмі з замежжа даў дазвол на кантакты, у дзевяностым адважыўся прыехаць на Бацькаўшчыну.

Усю ноч я слухаў яго расповед пра жыццё, глядзеў на скалечаныя пальцы, зморшчаны сямідзесяціпяцігадовага мужчыны ўвесь у шнарах твар і з жахам думаў, што робіць вайна з простым чалавекам, і як доўга ён вымушаны пакутаваць ад яе, гэтаксама як ад бяздумнасці палітыкаў, што распачалі тую вайну.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Ігар Сідарук

ШТО ТЫ ПРЫГОЖАЯ — ТЫ НЕ ПАЧУЕШ...

Я сядзеў ля вады і не думаў, што калі-небудзь яшчэ нехта будзе сядзець побач. Проста сядзеў, проста глядзеў, як неба ператвараецца ў бездань, і ціхая самота не дазваляла звар'яцець канчаткова.

Але ты прыйшла, гэтак жа ціха села побач, і неба ўжо пачало ператварацца ў бездань у тваіх вачах. „Любіш медытацыі?" — спытала ты. „Я люблю прыгожых жанчын", — адказаў. „А я прыгожая?" — „Ты? Ты хочаш пачуць адказ зараз ці потым?" — „Потым..."

Відаць, ты ведала. Ужо тады, калі прысела каля мяне ля вады.

Але, так табе і не адказаў.

Ні ў той вечар, ні потым, калі сонца хацела выкрасці колер тваіх вачэй, а я нахабным чынам апярэдзіў яго. Толькі і выкраўшы, адначасна ашчадна і асцярожна пакінуў там, дзе яму і належыць быць, для вернасці паклаўшы тры ахоўныя лёгкія пячаткі на тваіх недаравальна ўсмешлівых вуснах. Ключы ад тых пячатак засталіся гарэць на маіх; самі вусны сталі ключамі — да тваіх мілых шчок, якія так па-дзіцячы і так па-жаночы ўздрыгвалі ад маіх дотыкаў, да тваёй спакушальнай шыі, дзе дрыжала тонкая жылка, відаць, ловячы пульс усё-такі майго сэрца, да тваіх не маленькіх і не вялікіх грудак, пра якія таксама нічога табе не сказаў, хоць бачыў і адчуваў іх прыгажосць кожнае імгненне, да сцяжынкі да ўпадзінкі з тваім пупком, цалуючы які, я шчасліва, затоена, пераможна і пяшчотна ведаў: усё толькі пачынаецца.

І ўсё ж, магчыма, наш пачатак быў яшчэ ля вады: калі заўважыў, як лёгка кранаецца плынь босай тваёй ступні, кожнага твайго пальчыка — падумаў яшчэ, чаму вадзе можна, а мне — не?..

Аказалася, можна. Можна — гаварыць табе, не размыкаючы вуснаў, толькі кранаючыся праменнае электрычнасці тваіх валасоў, толькі дыхаючы пахам інтымнасці тваёй скуры, толькі задыхаючыся час ад часу, радасна і без вынятку, у полымі навальнічных тваіх абдымкаў.

Не ведаю, ці чакала ты майго адказу. Дакладней, ведаю. Таму — так табе і не адказаў.

Ні ў той вечар, ні потым; калі ля вады застаўся толькі твой след — твой лёгкі след, які, калі прыгледзецца, яшчэ можна пабачыць і сёння.

22.11.2009

Пазнаем Літву

18 лістапада ў Асяродку навуковых даследаванняў у Ольштыне адбылася сустрэча з літоўскімі навукоўцамі. Госці гаварылі, м.інш. пра культурную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Цяпер на тэрыторыі Літвы пражываюць прадстаўнікі шматлікіх нацыянальнасцей. З меншасцей найбольш палякаў — каля 100 тысяч. Рускіх там 70 тысяч, беларусаў — 20 тысяч, украінцаў — 7 тысяч, татараў — звыш трох тысяч, караімаў — таксама звыш трох тысяч.

Беларускую мову можна пачуць на паўднёвым усходзе Літвы, дзе пражывае найбольш беларусаў і там захаваліся яшчэ беларускія традыцыі. У Літве працуюць беларускія суб'екты, такія як Таварыства беларускай культуры, Клуб беларускай народнай творчасці „Сябрына", Таварыства беларускай школы, ёсць радыё- і тэлеперадачы, працуе кафедра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры. Выйшаў зборнік мастацкіх твораў „Дарункі бацькоўскай зямлі".

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

На каронна-літоўскім памежжы (2)

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У Баброўцы тратуар з польбруку, пакладзены ў 2007 годзе коштам у 80 тысяч злотаў; дзеля параўнання: у парафіяльнай Бжазоўцы тратуара зусім няма. Калі я ступаў на той тратуар, быў акурат поўдзень і раздалася мелодыя з касцельных курантаў. Бо ў Баброўцы, якая ў Бжазоўскай парафіі (у якой усяго 830 душ), таксама ёсць свой касцёл, пабудаваны ў 1989-1991 гадах за захадамі народжанага тут іерарха. Варта пры нагодзе заўважыць, што Славой Лешак Глудзь быў назначаны палявым ардынарыем акурат у пачатку 1991 года. Касцёл у Баброўцы, хаця лічыцца філіяльным, значна большы кубатурай за парафіяльны ў Бжазовай. У тым жа 1991 годзе ў Баброўцы былі закладзены могілкі, на тых могілках ёсць капліца; на могілках у парафіяльным Бжазове і дэканальным Карыціне капліц няма…

Касцёл у Баброўцы

Паміж могілкамі і вёскай распаложаны спартыўны комплекс; ёсць там футбольная пляцоўка, валейбольная, баскетбольная. Аднак найбольш у нас папулярны футбол, здаецца, не зацікавіў надта баброўскіх спартсменаў, бо траўка, хаця на цэлай пляцоўцы выкашаная нейкі час таму, аднак пад брамкамі такая ж як і ўсюды, слядоў змагання на ёй не відаць. Затое над цэлым гэтым комплексам на высокай мачце развяваецца на ветры бела-чырвоны сцяг, які, мабыць, вісіць там здаўна, бо ўжо патрабуе нейкага рамонту, бо ад яго вецер адарваў крыху матэрыялу…

Баброўка, у якой праходзяць такія ж грамадскія працэсы, што і ў іншых вёсках, напрыклад, старэнне насельніцтва, як у згаданай Бжазовай, ад тых іншых вёсак адарвалася інфраструктурнай успышкай. Быццам у ёй нехта задумаў пабудаваць нейкую Вёску-Сонца, нейкую ўзорную Аркадыю са светлай будучынёй. Можна дадумвацца, крыху ведаючы сёе-тое пра грамадскія кліматы ў Найяснейшай, з чаго выросла такая кветачка. Яшчэ раз прывяду вытрымку з Ягенкі Вільчак: „Głódź okazał się człowiekiem zdolnym do nawiązania kontaktów z wojskiem. Potrafił też wystąpić w roli jego adwokata, bo armia wyszła z minionego okresu poraniona i pełna rozterek — przypomina Bronisław Komorowski, były minister obrony. Wspólny język znajdował zwłaszcza z generałami — szli pod jego skrzydła licząc, że ich uchroni przed emeryturą. To biskup polowy bronił wojsko przed dekomunizacją. — Wałęsa chciał wyciąć wszystkich wyższych oficerów, ja przekonywałem, że mundur ich może był obcy, ale serce polskie — relacjonuje rozmowę, świetnie parodiując sposób mówienia i intonację byłego prezydenta”. Ці ж тыя генералы не ведалі, што ўзрадуе польскае сэрца, ці ж маглі яны бяздзейнічаць у абставінах, калі вырашаўся іх лёс? Ці ж спрактыкаваныя палкаводцы не зазубрылі калісь, што можна пабудаваць светлую будучыню ў адной асобна ўзятай ці то краіне, ці то вёсцы? Але і цывільныя чыны ведаюць, што арцыбіскуп Глудзь курыруе Радыё Марыя, якое часам можа даваць падказкі найбольш разгубленаму электарату…

У Камёнцы, вялікай вёсцы, якая ўжо ў Ясянаўчанскай гміне, яшчэ „кароннай”, засмучаючы выгляд вялікага мураванага, двухпавярховага будынка былой школы. Затое весялей у Карыціне, ужо „велікакняжацкім”. На будынку тамашняй Гміннай управы працуе электронны інфарматар з мабільным тэкстам. 18 лістапада 2009 года паказваў ён дату 2 мая 2000 года, а гадзіннік паказваў хіба нейкі маскоўскі час. Павешаны з іншага боку таго ж будынка насценны гадзіннік адпачываў. А вось у Баброўцы гадзіннік з курантамі на тамашнім касцёле паказваў акуратненькі час, але тамашні аб’ект быў пасвечаны ватыканскім кардыналам Анджалінім. Аднак Карыцін не здаецца Ватыкану — вось побач згаданай Гміннай управы стаіць драўляны помнік Яну Паўлу II. Хаця Ватыкан яшчэ не аб’явіў польскага папы святым, то энергічныя карыцінскія радныя, мабыць, помнячы колішні ўсходні запавет дагнаць і абагнаць той казытлівы Захад, самі грамадскім чынам датэрмінова, бо ўжо ў 2008 годзе, wybiegli przed szereg, аб’явіўшы свайго папу святым…

Помнік каралю Жыгімонту III Вазе ў Карыціне

Позняя восень гэта час кароткіх дзён і доўгіх начэй. Што рабіць дзіцяці, калі на двары ўжо непраглядная цемра, а на гадзінніку яшчэ 6 ці 7 гадзін вечара? Спаць яшчэ зарана, а значыць самы час на чытанне разам з дарослымі казак ці баек. Зразумела, для такога занятку лепей за ўсё падыходзіць кніжка з малюнкамі, але ад беларускіх дзіцячых кніг, на жаль, не ломяцца паліцы кнігарняў — знайсці добрую кнігу падобнага кшталту — цяжкая справа. І тут на дапамогу прыходзіць інтэрнэт.

У сусветным павуцінні не так даўно з’явіўся сайт, які без перабольшання можна назваць скарбонкай беларускіх народных казак і гульняў. Месціцца ён па адрасе http://kazki.unicef.by.

Афармленне сайта сапраўды арыгінальнае. Вэб-дызайнеры, што рупіліся над яго ўпрыгожаннем, маюць добры густ, разумеюць, чым прыцягнуць увагу дзіцяці, якімі малюнкамі пацешыць вочы малых.

Сайт мае ўсяго толькі чатыры старонкі. Гэта „Казкі”, „Гульні”, „Скачаць” і „Аб праекце”. Праўда, іх інфармацыйнаму і функцыянальнаму напаўненню могуць пазайздросціць шматлікія іншыя сайты. Так, у рубрыцы „Казкі” мы можам не толькі паглядзець малюнкі да іх, прачытаць першыя сказы той ці іншай казкі, але і праслухаць кожную казку і, нават, скачаць (спампаваць) з сайта сабе на камп’ютар.

Рубрыка „Гульні” найлепшым чынам развівае лагічнае мысленне дзіцяці. Аўтары сайта прапаноўваюць пазбіраць карцінкі з пазлаў. Карцінкі тычацца некаторых казак, змешчаных на сайце.

Старонка „Скачаць” дазваляе спампаваць цэлую кніжку для расфарбоўкі малюнкаў. Раздрукаваўшы потым на папяровым носьбіце, бацькі могуць прапанаваць сваім дзецям, узяўшы ў рукі алоўкі, размаляваць карцінкі да той ці іншай казкі.

Паколькі сайт быў створаны пад эгідай ЮНІСЕФ, то без прававога напаўнення тут не абышлося. Унізе кожнай старонкі месціцца выйсце да тэксту „Канвенцыі аб правах дзіцяці”. Праўда, нягледзячы на беларускамоўнасць цэлага сайта, канвенцыя падаецца па-руску.

„Дзяцінства немагчыма ўявіць без казкі, таму што слухаць казкі, якія табе расказваюць тата і мама, бабуля ці дзядуля, ці добрая выхавацелька, калі бацькоў няма побач — гэта адно з правоў дзіцяці, запісаных у Канвенцыі аб правах дзіцяці”, — абгрунтоўваюць сэнс свайго праекта, звязваючы яго з аанаўскім дакументам, аўтары сайта, якіх прадстаўляе Юрый Аксамітны, прадстаўнік ЮНІСЕФ — Дзіцячага Фонду ААН у Рэспубліцы Беларусь.

„Калі мы гаворым пра Канвенцыю аб правах дзіцяці, у першую чаргу мы думаем пра глабальныя рэчы: пра мір, пра вайну, пра адукацыю, пра ежу, пра жытло і здароўе. Бясспрэчна, гэта вельмі важна. Але Вашая ўвага, Вашыя абдымкі, Вашая сіла і абарона, Вашая пяшчота і клопат вельмі патрэбныя Вашым дзецям”, — працягвае далей Аксамітны.

Прадстаўнік ЮНІСЕФ мае надзею, што прыгожыя і самабытныя беларускія казкі, якія наведвальнікі сайта будуць чытаць і слухаць разам з дзецьмі, правы і абавязкі, пра якія пойдзе ў іх размова, „стануць яшчэ адным мастком узаемаразумення паміж двума такімі рознымі і цудоўнымі сусветамі — дзіцячым і дарослым”.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

У лістападзе ўпад

Апошні месяц восені быў адзначаны для беларускага спорту некалькімі значнымі поспехамі на чэмпіянатах свету па цяжкай атлетыцы, самба і скачках на батуце. Мужчынская зборная па самба на планетарным форуме, што прайшоў у грэчаскіх Салоніках, заняла 3-е агульнае месца, а жаночая — 2-е. Разам яны ўзялі тры залатыя, два сярэбраныя і шэсць бронзавых медалёў. Станоўча вызначыліся і айчынныя акрабаты. Мужчынская дружына, за якую выступалі Якаў Ракіцкі, Мікалай Казак, Яўген Жукоўскі і Вячаслаў Модэль, на планетарным першынстве ў Санкт-Пецярбургу стала другой. Жанчыны ў аналагічным камандавым спаборы занялі 4-е месца. А квартэт скакуноў на акрабатычнай дарожцы (Дзмітрый Дарашук, Андрэй Кабішаў, Сяргей Прымакоў, Сяргей Арцёменка) дамогся пачэснай бронзы. Што датычыць камандавых гульнёвых відаў, то ўразіў суцэльны крах усіх мужчынскіх гандбольных клубаў у 1/16-й кантынентальных еўракубкаў. Канфузам скончыўся дэбют баскетбольнага „Мінска-2006” у так званым еўрачэленджы — паразай з розніцай у 38 ачкоў (!) ад самарскіх „Чырвоных крылаў”. Менскае „Дынама” прадоўжыла падзенне ў рэгулярным чэмпіянаце КХЛ. А парадавала моладзевая футбольная зборная, якая ў гасцях у адборавым матчы да чэмпіянату Еўропы адолела Албанію 2:1 і застаецца рэальным прэтэндэнтам на першае месца ў групе.

У індывідуальным „заліку” ровень вылучэння ў лаўрэаты месяца на гэты раз вельмі высокі. Адзначаем тых, хто ў лістападзе здолеў выйсці на пік формы і трапіць упапад, а таксама павялічваем фармат да лепшых шасцёрак.

1. Сяргей Лагун (цяжкая атлетыка) не ўваходзіў у лік фаварытаў чэмпіянату свету ў карэйскім Гаяне, але ўрэшце выйграў малыя бронзу ў рыўку, золата ў штуршку і серабро ў суме. Прадстаўнік Наваполацка вызначыўся ў катэгорыі да 85 кілаграмаў.

2. Юрый Рыбак (самба) стаў другім у свеце ў катэгорыі звыш 100 кілаграмаў. Звяртае на сябе ўвагу стабільнасць атлета, які з поспехам выступае і ў дзюдо.

3. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) у матчы ўсіх зорак Еўропы і Азіі, што адбыўся ў Стамбуле, прынёс вікторыю прадстаўнікам старога свету — 6:5. Лёс сустрэчы вырашыўся ў дадатковым паядынку, які выйграў менавіта беларус.

4. Андрэй Кулебін (муай-тай) заваяваў ужо 16-ы пас чэмпіёна свету па версіі WMC. У Манчэстэры ён накаўтаваў брытанца Майкла Дзікса.

5. Дзмітры Шакута (тайскі бокс) 11-ы раз стаў чэмпіёнам свету сярод прафесіяналаў. На турніры ў горадзе Берневельдзе (Нідэрланды) ён абараніў свой тытул у баі з мясцовым прадстаўніком Семам Бранам.

6. Максім Мірны (вялікі тэніс) у пары з ізраільцянінам Эндзі Рамам выйшаў у фінал заключнага турніру года, што прайшоў у Лондане. У вырашальным матчы інтэрнацыянальны дуэт сустракаўся з амерыканскімі братамі Майкам і Бобам Браянамі, але на жаль саступіў.

1. Настасся Новікава (цяжкая атлетыка) стала віцэ-чэмпіёнкай свету. Прычым у новай для сябе катэгорыі да 58 кілаграмаў. Гэта ўжо другі сярэбраны медаль у кар’еры таленавітай штангісткі

2-4. Кацярына Пракапенка, Настасся Ляшкова і Кацярына Радзевіч (усе самба) сталі чэмпіёнкамі планеты адпаведна ў катэгорыях да 60, 64 і 72 кілаграмаў.

5. Меліта Станюта (мастацкая гімнастыка) стала бронзавай прызёркай у шматбор’і на турніры Гран-пры ў Берліне.

6. Юлія Барысік (самба) у катэгорыі звыш 80 кілаграмаў заваявала сярэбраную ўзнагароду.

Напярадзе снежань — месяц падсумавання спартовых дасягненняў года.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Беларускі фэст у Райску

Выступае „Калінка”

Весела ды цікава прайшоў беларускі фэст у нядзелю 22 лістапада ў будынку Вясковага дома культуры ў Райску на Бельшчыне. Арганізатары праекта „І тут жывуць людзі” з Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы не забыліся і пра беларусаў, што жывуць каля Бельска. Галоўнай мэтай серыйных мастацкіх выступленняў перад сельскімі жыхарамі з'яўляецца жаданне завітаць з беларускай песняй, і не толькі, туды, дзе яшчэ застаюцца жыць людзі, пераважна старэйшага пакалення, і дзе ад многіх гадоў не арганізуюцца культурныя сустрэчы. І такое жаданне ў Райску здзейснілася, зрэшты не толькі для арганізатараў. Ахвотных паслухаць „сваіх” песень жыхароў Райска і навакольных вёсак назбіралася мнагавата. На жаль, не ўсе раней ведалі пра такую сустрэчу.

— Я ўжо даўно не была такая шчаслівая, — прызналася адна жанчына з публікі пасля канцэрта. Задаволеныя з выступленняў спевакоў бадай былі ўсе прысутныя, хаця некаторыя са старэйшых скардзіліся на гучнасць музыкі ды шкадавалі, што не было гармоніка.

І сапраўды ў Райску выступілі маладыя спевакі пад гукі электронных інструментаў. Аднак чуліся „свойскія” песні: беларускія, украінскія і рускія. Толькі на пачатак, як госці ў сваёй вёсцы, з некалькімі песнямі выступілі „Згодныя макі” з Райска.

Найбольш гучныя воплескі чуліся падчас бадзёрага выступлення з вясёлымі беларускімі песнямі калектыву „Калінка” з Гарадоцкай гміны. Маладыя і прыгожыя дзяўчаты пад мастацкім кіраўніцтвам Марыюша Харужага зачаравалі прысутных і мусілі праспяваць на біс.

Затым выступіў дуэт „Selectiv” з Гайнаўшчыны: Адам Дунда і Марк Мароз, якія асабліва спадабаліся жанчынам.

За паспяховым правядзеннем праграмы ўважліва сачыў дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы Янка Карпюк з жонкай Ірэнай і вядучай канцэрт Марыёляй Герман.

Канцэрт закончыў гурт „ART. Pronar” з Нарвы, які азартнымі папулярнымі на Падляшшы гітамі ды дасціпнасцю да таго разагрэў прысутных, што некаторыя нават танцавалі.

Пасля такой сімпатычнай сустрэчы з беларускай культурай пажылым жыхарам Райска і навакольных вёсак, пакуль яшчэ яны тут жывуць, застаецца глядзець зноў у тэлевізар. Седзячы восеньска-зімнімі вечарамі ў вясковых хатах, успамінаюць яны маладыя гады і спадзяюцца, што яшчэ нехта прыедзе з канцэртам у іх вёску.

Тэкст і фота Яна МОРДАНЯ

Сярод публікі — раенскі бацюшка а. Яраслаў Годун з матушкай Ірэнай і старшыня рады Бельскай гміны Валянцін Галушэўскі з жонкай Тэрэсай.

3 ☞працяг з прэзідэнтам. Таму што калі гаворка ідзе пра мясцовае самакіраванне, гэта ўзаемадзеянне з тымі, каго няма. А ёсць на гэтым месцы людзі прызначаныя прэзідэнтам. І з імі, калі будзе ўзаемадзеянне, пачнуць паводзіць сябе па-заходняму — яны будуць зменены. Такія прыклады ўвесь час ёсць. Рыбка наша павінна быць зачэплена з галавы!

— Што хоча Беларусь дасягнуць шляхам мытнага саюза Беларусь — Расія — Казахстан?

— На гэта вельмі цяжка адказаць. Тут ёсць многа супярэчлівых фактараў. Мне здаецца: яны хочуць супрацьпаставіць такі эканамічны саюз, каб больш развіваўся гандаль паміж імі і быў большы абмен. Але цвярозыя дасведчаныя эканамісты гавораць, што гэта вельмі цяжка. Таму што гэта не спалучаецца з тымі абавязкамі і з тымі справамі, якія Беларусь хоча мець з Еўропы. Такі калектыўны ўваход у сусветную гандлёвую арганізацыю практычна немагчымы. Гэта заявілі лідары Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Чаго Беларусь дамагаецца? Гэта такі прыгожы жэст улады, як быццам яна хоча рэфармавацца, каб лепшае было жыццё ў Беларусі.

— Што хацелі Вы, у сённяшні дзень, сказаць аб двухбаковых стасунках паміж Польшчай і Беларусю, міністру Сікорскаму?

— Я ўсё гэта сказаў міністру Сікорскаму асабіста, чатыры месяцы таму. Я ўсё сказаў. І не ўсё трэба агалошваць. Я перакананы, што міністр Сікорскі шукае спосабаў паляпшэння сітуацыі з Беларуссю. Але ў мяне такое ўражанне, што па пэўных накірунках ён займае не тую пазіцыю, якая была б найлепшая. Вось ва Усходнім партнёрстве няма пазіцыі „культура”. Па гэтай пазіцыі могуць узаемадзейнічаць людзі розных узроўняў і розных палітычных перакананняў, але гэта іх будзе аб'ядноўваць. Культура да ўсяго дадаецца са знакам плюс. А палітыка — са знакам мінус. Мы на гэтую тэму гаварылі з тымі, хто быў аўтарам, у прыватнасці са Шварцэнбергам у Чэхіі. Ён сказаў: мы будзем імкнуцца, каб пазіцыя культуры была ў Партнёрстве. І адукацыйная палітыка гэта вельмі важная ва Усходнім партнёрстве... Я вельмі ўдзячны Польшчы, якая робіць вялікую справу. І таму я гэта яшчэ раз падкрэслю: я не магу рабіць заўвагі ў адрас кіраўніка знешняй палітыкі палітычнага ведамства той краіны, якая робіць вельмі добрую справу для Беларусі: праграму Каліноўскага, навучанне нашых студэнтаў, навучанне нашых дактарантаў, розныя нарады і канферэнцыі, між іншым гэтую, на якой мы сустрэліся сёння...

— Дзякуем за размову.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Адгаданка

1. рэгіён на паўночным захадзе Украіны, 2. б'е, не заб'е перад Вялікаднем, 3. сум, маркота, панылась, 4. рака ў Ужгарадзе, 5. будынак для выступленняў акрабатаў, прэстыдыжытатараў, клоўнаў, дрэсіроўшчыкаў, 6. кавалак дрэва ў форме ступні, які выкарыстоўваецца пры шыцці абутку, 7. вышэйшая яўрэйская школа для вывучэння Талмуда, 8. квадратны корань з чатырох, 9. пераноснае жыллё азіяцкіх качэўнікаў, крытае шкурай, 10. цвёрдая набойка пад пятой абутку, 11. раскошны будынак манарха.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нідэрландская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 44 нумара

Джут, джын, жур, лес, пасія, Сахара, чыгун, яздок.

Рашэнне: **Стары друг на чужыне — як дождж пасля засухі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.



Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (3)

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Міры ЛУКШЫ

Гарошкаўцы на фоне кніжнай сценкі Анатоля

На Калодзішчанскіх могілках за Мінскам мы наткнуліся на помнік аздоблены з двух бакоў камп'ютарным дызайнам. Спераду красаваўся партрэт маладога нябожчыка з буйной прычоскай у хвалі. На заднім баку шырокай і простай дарогай сярод векавых соснаў „імчала" сама сабе аўтафура. Здавалася, машына перасякла дазволеную хуткасць...

Просты і тыповы камунікат часоў камп'ютарна-карцінкавай цывілізацыі. І непісьменны здагадаецца, што ў зямным жыцці нябожчык быў шафёрам і праўдападобна загінуў у дарожнай катастрофе. У гэтым міні-аповедзе пра жыццё і смерць чалавека інтрыгавала адна дэталь — рытуальны кілішак з гарэлкай, які налілі сваякі і паставілі разам з гурбай штучнага квецця на намагільнай пліце пакойніку. У голаў адразу лезла дурное, між іншым, што хлапец загінуў з-за гарэлкі...

Каб пакінуць вечнасці камунікат пра жыццё і смерць чалавека, старажытныя беларусы падпіраліся пісаным словам. Абрад „запісу" чалавека адбываўся якраз на Дзяды. Гэты архаічны звычай прыкмеціў яшчэ ў 1914 г. Вацлаў Ластоўскі ў нашых Кленіках. Да хаты, дзе цягам бягучага года нарадзіўся або памёр чалавек, клікалі грамацея. Той вырэзваў на бэльцы ля святога кута імя і год нараджэння дзіцяці. Калі ў сям'і хтось памёр, грамацей высякаў дату зыходу члена сям'і. Такі спісак звычайна ўключаў прадстаўнікоў роду ад сямі да дзесяці пакаленняў. У маёй роднай хаце (дзесяць кіламетраў ад Кленік) на сцяне, на левым баку ад святога кута, заўсёды вешаюць каляндар „Нівы". На ім таксама значаць: хто калі з радні нарадзіўся і памёр. Разам адзначаюць і звесткі пра хатнюю жывёлу, напрыклад, калі ацялілася карова...

* * *

Падобны камунікат пра жыццё і смерць аўтара ўяўляюць сабой паліцы ў кніжных магазінах. Калі мы ішлі ў гродзенскую кнігарню, што па вуліцы Элізы Ажэшка, я не разлічвала, што ўбачу там кніжкі Анатоля Сыса. Творчасць гэтага знакамітага аўтара не можа прабіцца на афіцыйны беларускі кніжны рынак. Праўда, такі цуд час ад часу здараўся. У лютым 1990 года я набыла ў дзяржаўнай кнігарні ў Мінску непрыкметны па афармленні томік „Пан лес" (выдадзены ў 1989 г.). Па змесце і сэнсе гэты сціплы на выгляд зборнік я лічу найлепшым у гісторыі беларускай літаратуры. Ён са мною ў балючыя дні народзінаў і памінанняў. На афіцыйным рынку можна было яшчэ набыць выдадзены ў 1988 годзе „Агмень" — першую паэтычную ластаўку маладога паэта, — як два гады пасля бліскучага дэбюту ў часопісе „Маладосць" пісалі пра вершы Анатоля Сыса літаратурныя крытыкі. Два іншыя зборнікі: „Лён" (2007) і „Alaiza" (2009) падарылі сябры паэта. Сам Анатоль ахвяраваў і падпісаў трэці па ліку том „Сыс". Кніжка пабачыла свет у 2002 годзе дзякуючы, між іншым, прыватнай спонсарцы і гарачай прыхільніцы паэта Валянціне Якімовіч. Пасмяротныя выданні таксама з'явіліся па ініцыятыве і падтрымцы прыхільнікаў і сяброў паэта.

Здаецца, чытачам „Нівы" не трэба асвятляць славутай гродзенскай кнігарні па вуліцы Элізы Ажэшка. Большасць вядомых мне беларусаў Беласточчыны, раней чым прысядзе ў архівах або ў рэстаранах, спачатку загляне ў гэты магазін. У жэсце можна прыкмеціць рысы рытуалу. Наведвальнік не разлічвае на свежыя прапановы кніжнага рынку. Ён ведае, што на дзвюх, адведзеных для беларускай кніжкі сценках, дарэчы, запхнутых у левы вугал сцяны ад уваходу (часам іх аздабляюць вышыванымі ручнікамі), нішто не памянялася. Як год раней на верхніх паліцах будзе Якуб Колас, на ніжніх — Кузьма Чорны. Але нічога. Наш наведвальнік паклоніцца сценкам, пройдзецца між прылаўкамі з рускамоўнымі альбомамі, ды, не знайшоўшы там нічога цікавага, выйдзе з кнігарні...

Я таксама не разлічвала, што ў Гродне пабачу кніжку Анатоля Сыса. Але тут чакалі нас неспадзеўкі. На сценках з беларускай літаратурай жанчына з анучкай наводзіла парадак. Яна выціралa пыл з жалезнай класікі і ставіла яе ў іншым, чым год раней, парадку. Калі я наблізілася да славутых паліц, ззаду як нешта грымне! Я азірнулася і пабачыла на падлозе альбомы пра айчынную прыроду (на рускай мове). Праз момант я адчувала сябе як слон у пасуднай краме. Але сеанс у кнігарні толькі што пачынаўся. Пасля, калі я спынілася ля прылаўка з праваслаўнай літаратурай, кніжкі зноў звaліліся на падлогу. Тут таксама не было ні адной кніжкі, ні календара на беларускай мове. Кніжкі зляцелі яшчэ раз на падлогу, калі ў эмоцыях я пакідала магазін і нехаця зачапілася локцем аб прылавак. У гэты раз пад мае ногі высыпаліся рускамоўныя брашуры з галіны натуральнай медыцыны і астралогіі.

Не дзіва, што пасля таго ўсяго мяне трэба было пашмараваць эфірным маслам. Гэты цудоўны прэпарат родам з сэрца Алтая Міра Лукша набыла ў аптэцы, што па-суседску са славутай кнігарняй.

— Я адчуваю, што сёння мы кагосьці сустрэнем! — прамовіла мая сяброўка такім тонам быццам ужо і ведала каго...

(працяг будзе)

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Калодзішчанскія могілкі. Камунікат вечнасці пра жыццё і смерць беларускага шафёра

05.12 – 11.12

(22.03. – 20.04.) У любоўных справах усё складзецца як найлепш. Будзь шчодры, а неўзабаве пераканаешся, што добрая энергія да цябе вернецца. Будзеш самаўпэўнены, вясёлы, поўны энтузіязму — з 9.12. (да 13.12.); будуць прыбыткі, добрая кан'юнктура ў інтарэсах, усе ўбачаць тваю кемлівасць і ініцыятыву.

(21.04. – 21.05.) Да 6.12. няўпэўненасць, паддаванне сябе благім уплывам, лішняя ахвярнасць; не дай, каб цябе выкарыстоўвалі. Будзеш зіхацець энергіяй і не будзе для цябе немагчымага. Адкрыешся на пачуццё, якога ніколі яшчэ не спазнаў!

(22.05. – 22.06.) Гайданка настрояў. Не трапляй у крайнасці! Блага прадказваючыеся здарэнні з часам акажуцца вельмі ўдалымі. Пераканаешся, што ты з партнёрам — адно. 5-9.12. выкажашся вялікай паслядоўнасцю, будзеш здольны да вялікага высілку.

(23.06. – 23.07.) Будзеш мець вялікае шчасце, сустрэне цябе шмат мілых сюрпрызаў. У каханні — цудоўна! Невялікім коштам можаш шмат дасягнуць. Ды 5-9.12. зоркі могуць прынесці расчараванне, пагоршанне настрою; пільнуйся ад інфекцый і атручвання.

(24.07. – 23.08.) Не будзе табе роўных на працы і ў дасяганні асабістых мэт. З 9.12. (да 13.12.) знакамітыя дні на флірты, любоў, гарачыя жарсці, а таксама на сустрэчы ды хуткія і трапныя фінансавыя і прафесійныя рашэнні. Адарвешся ад таго, што табе тлуміць галаву.

(24.08. – 23.09.) Спакойна і трапна падыдзеш да спраў, якія раней даводзілі цябе да белай гарачкі. Неспакойная сітуацыя не працягнецца доўга, але будзе каштаваць яна шмат здароўя (6-10.12.); не панікуй! 5-9.12. прыцягваеш грошы як магніт; выкарыстай добры час на карысныя кантракты.

(24.09. – 23.10.) Будзеш спрытны і прадпрымальны. Разлічвай на шчырыя і адданыя адносіны з іншымі. Дацэніш каштоўную асобу, якая здавалася табе быць нуднай і нецікавай. Будзеш ашаламляльна папулярны! Будуць зайздроснікі!

(24.10. – 22.11.) Каб знайсці шчасце ў пачуццях, перамажы ўласныя тармазы. Будзеш такі забеганы, што калі нават абжарэшся, хутка страціш кілаграмы! Усё, чаго дасягнеш, будзеш абавязаны самому сабе. Лёгкай рукой раздасі, што зарабіў, але хопіць і табе!

(23.11. – 22.12.) Разлічвай на сябе і не аглядайся на іншых. Нават калі ты здэкларованы самотнік, паддасіся рамантычнай атмасферы. Будзеш дысцыплінаваны і крыху скупы. Будзеш схільны да змен, але не такіх, якія перакулілі б твой свет.

(23.12. – 20.01.) Някепская фізічная і псіхічная форма. Твая сціпласць і лаяльнасць будуць заўважаны. Калі 6-10.12. здаеш якісьці экзамен, вынік можа цябе расчараваць (квадратура Сатурна з Меркурыем!) — можаш сумнявацца ў сваіх здольнасцях і ведах, можаш нарабіць памылак. Пільнуйся!

(21.01. – 19.02.) На пачатку тыдня маеш шанцы на добрыя інвестыцыі і фінансавую стабільнасць. Маеш нагоду пазнаць асобу, пры якой моцна заб'ецца тваё сэрца; не адкладвай кахання і ад яго не ўцякай! Хай цябе вядзе голас інтуіцыі.

(20.02. – 21.03.) Пахваляць цябе на працы. Калі цябе хтосьці пакрыўдзіў, не мсціся. Чым больш будзеш зарабляць, тым паскупееш. Пільнуйся: да 8.12. можаш занядбаць тое, што найважнейшае, ганяючыся за малаважным. Можаш радыкальна парваць з непажаданымі асобамі. Пільнуйся, каб не прастыць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960